URZĄD DO SPRAW CUDZOZIEMCÓW

# Першыя крокі ў Польшчы

## Інфармацыйная брашура для замежнікаў

**У гэтым даведніку прадстаўлена інфармацыя аб вашым далейшым знаходжанні ў Польшчы.**
**Ён падзелены на 4 часткі:**


- Інфармацыя пра Польшчу (тут вы знойдзеце асноўную інфармацыю пра Польшчу, яе гісторыю, клімат, кухню і звычаі) – **стар. 4**
- Працэдура прадастаўлення міжнароднай абароны (тут вы даведаецеся пра наступныя этапы працэдуры прадастаўлення статусу бежанца з моманту падачы хадайніцтва да вынясення канчатковага рашэння, а таксама пра тое, на што варта звярнуць увагу) – **стар. 17**
- Сацыяльная дапамога (тут вы даведаецеся аб магчымых відах сацыяльнай дапамогі, на якую вы маеце права як заяўнік на міжнародную абарону, і знойдзеце інструкцыі па выкананню розных фармальнасцей) – **стар. 22**
- Рашэнне па справе аб прадастаўленні міжнароднай абароны (у гэтым раздзеле вы даведаецеся, што трэба зрабіць пасля атрымання рашэння па вашай справе) – **стар. 43**



*Wyłączna odpowiedzialność za wyrażone opinie spoczywa na autorze, Komisja Europejska oraz Ministerstwo Spraw Wewnętrznych i Administracji nie ponoszą odpowiedzialności za sposób wykorzystania udostępnionych informacji*

**Змест**

**ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ПОЛЬШЧУ** ..... **4**
ПОЛЬШЧА СЁННЯ ..... 5
КУЛЬТУРА ..... 6
НАВУКА ..... 7
СПОРТ ..... 7
КЛІМАТ/ПОРЫ ГОДА ..... 8
ПОЛЬСКІЯ НОРМЫ І ЗВЫЧАІ ..... 9
ГАЛОЎНЫЯ ПОЛЬСКІЯ СВЯТЫ ..... 11
ПОЛЬСКАЯ КУХНЯ ..... 12
СУВЯЗЬ ..... 12
ГРАМАДСКІ ТРАНСПАРТ ..... 12
НУМАР PESEL ..... 16
БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА ..... 16

**ПРАЦЭДУРА ПРАДАСТАЎЛЕННЯ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ** ..... **17**
ІНТЭРВ'Ю І ПРЫНЯЦЦЕ РАШЭННЯ ..... 18
АДМЕНА ПРАЦЭДУРЫ ПРАДАСТАЎЛЕННЯ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ ..... 19
НЕПРЫМАЛЬНАСЦЬ ХАДАЙНІЦТВА АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ ..... 19
НАСТУПСТВЫ АДМОЎНАГА РАШЭННЯ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ ..... 20
ТАК.ЗВ. ДУБЛІНСКАЯ ПРАЦЭДУРА ..... 20
БЯСПЛАТНАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І ДАПАМОГА ..... 21

**САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА** ..... **22**
ПАМЕР ГРАШОВАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПА-ЗА МІГРАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРАМ ..... 22
ПАМЕР ГРАШОВАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў МІГРАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРЫ ..... 23
ПРАЖЫВАННЕ ..... 23
ПЕРАВОД У ІНШЫ ЦЭНТР ..... 24
МЕДЫЦЫНСКІЯ АГЛЯДЫ ..... 25
МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА ..... 25
ХАРЧАВАННЕ ..... 27
ГРАШОВЫ ЭКВІВАЛЕНТ ..... 28
ВЯРТАННЕ КОШТУ БІЛЕТАЎ ..... 28
БЯСПЕКА Ў МІГРАЦЫЙНЫХ ЦЭНТРАХ ..... 29
ВЫХАД З ЦЭНТРА ..... 30
ПРАВЫ ПРАЖЫВАЮЧЫХ У ЦЭНТРЫ ..... 31
АБАВЯЗКІ ПРАЖЫВАЮЧЫХ У ЦЭНТРЫ ..... 31
ЗАБАРОНЫ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ ЦЭНТРА ..... 31
ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА І ІНШЫЯ РЫЗЫКІ ..... 32
ЗЛАЧЫНСТВЫ - ШТО ЗАБАРОНЕНА Ў ПОЛЬШЧЫ ..... 32
НАСІЛЛЕ ..... 33
АБАРОНА ДЗЯЦЕЙ ..... 34

ЗАКЛЮЧЭННЕ ШЛЮБУ ПАМІЖ НЕПАЎНАЛЕТНІМІ АСОБАМІ ... 35
АДУКАЦЫЯ ... 36
ПОЛЬСКАЯ МОВА ... 37
НАРАДЖЭННЕ ДЗІЦЯЦІ ... 38
ПРАЦА Ў ЦЭНТРЫ ... 39
ПРАЦА ЗА МЕЖАМІ ЦЭНТРА ... 39
ЯК ПРАДОЎЖЫЦЬ TZTC ... 40
ХАДАЙНІЦТВЫ І СКАРГІ ... 41
ВЯРТАННЕ Ў КРАІНУ ... 41

**РАШЭННЕ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ ... 43**

**ВАЖНЫЯ КАНТАКТНЫЯ ДАНЫЯ ... 44**

**СЛОЎНІК ... 46**

**ВАРШАВА ... 47**

**ЯК ДАЕХАЦЬ ДА ПРЫЁМНАГА ЦЭНТРА ў Г. ПАДКОВА-ЛЕСЬНА-ДЭМБАК ... 48**

# ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ПОЛЬШЧУ

**Сцяг**



**Герб**



**Карта Еўропы з выдзеленай Польшчай**



**Польская Рэспубліка** знаходзіцца ў Цэнтральнай Еўропе, паміж Балтыйскім морам на поўначы і Карпацкімі гарамі і Судэтамі на поўдні, у басейне найбуйнейшых польскіх рэк Віслы і Одэра. Агульная плошча Польшчы складае 322 575 км2. Яе насяляюць амаль 38 мільёнаў чалавек.

Польшча падзелена на 16 ваяводстваў. Сталіца краіны - Варшава, якая таксама з'яўляецца найбуйнейшым горадам. Іншымі мегаполісамі з'яўляюцца Гданьск, Кракаў, Лодзь, Познань, Шчэцін і Вроцлаў.

Краіна мяжуе з Германіяй на захадзе, Чэхіяй і Славакіяй на поўдні, Украінай і Беларуссю на ўсходзе, Літвой на паўночным усходзе і Расійскай Федэрацыяй (Калінінградская вобласць) на поўначы.

## ХРАНАЛОГІЯ НАЙВАЖНЕЙШЫХ ПАДЗЕЙ У ГІСТОРЫІ ПОЛЬШЧЫ

966 г. – Хрышчэнне Польшчы і сімвалічная дата стварэння польскай дзяржавы

1364 г. – заснаванне Кракаўскай Акадэміі, аднаго з першых універсітэтаў у Еўропе. 16 стагоддзе - так званы залаты век - перыяд у гісторыі Польшчы часоў кіравання апошніх Ягелонаў (Жыгімонта Старога і Жыгімонта Аўгуста). У той час Польшча была адной з самых магутных краін Еўропы.

1569 г. – Люблінская унія, утварэнне Рэчы Паспалітай («Рэспублікі абодвух народаў» - аб'яднання Польшчы і Літвы)

1596 г. - Перанос сталіцы з Кракава ў Варшаву

1772 г. - Першы падзел Польшчы, у выніку якога частка польскай тэрыторыі адышла да Прусіі, Аўстрыі і Расіі

1791 г. - прыняцце Канстытуцыі 3 мая - першай у Еўропе і другой у свеце канстытуцыі.

1793 - Другі падзел Польшчы, чарговыя тэрыторыі Польшчы былі занятыя Прусіяй і Расіяй

1795 г. - Трэці падзел Польшчы і поўная ліквідацыя Рэчы Паспалітай - Польшча знікае з карты свету больш чым на 120 гадоў

1815 г. – Венскі кангрэс, стварэнне залежнага ад Расіі Польскага Каралеўства

1830 г. - Лістападаўскае паўстанне

1863 г. - Студзеньскае паўстанне

1914 – 1918 – Першая сусветная вайна

11 лістапада 1918 г. – Польшча аднаўляе сваю незалежнасць

28 лістапада 1918 г. - Выдадзены Дэкрэт аб выбарчым праве для заканадаўчага сейма, дзякуючы якому полькі сталі аднымі з першых у свеце, хто атрымаў поўныя выбарчыя правы раней, чым амерыканкі, брытанкі або французжанкі

13 XIII 1920 - Варшаўская бітва працягвалася з 13 па 25 жніўня 1920 года падчас польска-бальшавіцкай вайны (у памяць пра перамогу 15 жніўня адзначаецца як Дзень Войска Польскага)

1 верасня 1939 г. – Напад нацысцкай Германіі на Польшчу, пачатак Другой сусветнай вайны

17 верасня 1939 г. - Напад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на ўсходнія польскія тэрыторыі

19 красавіка 1943 г. - Пачатак паўстання ў гета ў акупіраванай немцамі Варшаве

1 жніўня 1944 г. - Пачатак Варшаўскага паўстання супраць нямецкіх войскаў, якія акупіравалі Варшаву. Найбуйнейшы ўсплёск супраціву падчас Другой сусветнай вайны ў акупіраванай Еўропе

8 мая 1945 г. – Заканчэнне Другой сусветнай вайны для Еўропы

19 студзеня 1947 г. - Фальсіфікацыя выбараў, у выніку чаго да ўлады ў Польшчы прыйшлі камуністычныя партыі.

28 чэрвеня 1956 г. - Першая ўсеагульная забастоўка разам з вулічнымі дэманстрацыямі, арганізаваная ў Познані пад эканамічнымі і палітычнымі лозунгамі («хлеба і свабоды»). Пратэст быў крывава падаўлены ўладамі

VIII 1980 г. – Масавыя забастоўкі ў многіх гарадах Польшчы – пратэсты супраць сацыялістычных уладаў

13 снежня 1981 г. - Увядзенне ваеннага становішча па ўсёй краіне - арышты і інтэрніраванне палітычных актывістаў апазіцыі, забарона арганізацый і прафсаюзаў, забарона забастовак, увядзенне каменданцкай гадзіны

6 лютага 1989 г. - Пачатак перамоваў за Круглым сталом - пачатак дэмакратычных палітычных пераменаў у Польшчы

4 чэрвеня 1989 г. – Першыя часткова свабодныя выбары ў Сейм і цалкам свабодныя выбары ў Сенат. Грамадзянскі камітэт «Салідарнасць» атрымлівае 99 са 100 магчымых месцаў у Сенаце.

27 кастрычніка 1991 г. – Першыя цалкам свабодныя парламенцкія выбары ў Польшчы пасля Другой сусветнай вайны

12 сакавіка 1999 г. – Уступленне Польшчы ў НАТА

1 мая 2004 г. – Польшча становіцца членам ЕС

2018 г. – Стагоддзе аднаўлення незалежнасці Польшчы

## ПОЛЬШЧА СЁННЯ

### Палітычная сістэма

Польшча з'яўляецца дэмакратычнай рэспублікай, дзе грамадзяне выбіраюць прэзідэнта і парламент (Сейм і Сенат) на ўсеагульных выбарах. Выбары дэпутатаў у Сейм і сенатараў у Сенат праводзяцца кожныя 4 гады. Прэзідэнцкія выбары адбываюцца кожныя 5 гадоў. Выканаўчую ўладу ажыццяўляюць Прэзідэнт і Савет міністраў (урад на чале з Прэм'ер-міністрам). Тэрмін паўнамоцтваў урада, як і парламента, складае 4 гады.



### Грашовая адзінка

Польская валюта - злоты 1 PLN = 100 гр.

### Нацыянальная структура

Больш за 93% жыхароў заяўляюць аб польскай нацыянальнасці.

Найбуйнейшымі нацыянальнымі меншасцямі з'яўляюцца немцы, украінцы, беларусы і рускія. Сярод этнічных груп самай шматлікай з'яўляюцца ромы.



### Рэлігійныя канфесіі ў Польшчы

Самай вялікай рэлігійнай суполкай з'яўляюцца вызнаўцы каталіцтва - каля 87% насельніцтва. Аднак практыкуючыя вернікі складаюць каля паловы ўсіх вернікаў, астатнія часта характарызуюць сябе як «веруючыя, але непрактыкуючыя».

Працэнт практыкуючых вернікаў, адразу пасля Мальты, самы высокі ў Еўропе.

Польская канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнання і сумлення. Усе людзі незалежна ад веравызнання і светапогляду маюць аднолькавыя правы і могуць свабодна практыкаваць сваю веру. У Польшчы, акрамя касцёлаў, ёсць таксама праваслаўныя цэрквы, мячэці, сінагогі і іншыя храмы. Гісторыя суіснавання многіх культур і рэлігій узыходзіць да ўзнікнення польскай дзяржавы.



## ЭКАНОМІКА І ГАСПАДАРКА

Мінімальны заробак у Польшчы ў 2023 годзе складае 3490 злотых брута. Узровень беспрацоўя ў лютым 2022 года склаў 5,5%.

Па аб'ёму ВУП (валавога ўнутранага прадукту) Польшча з'яўляецца 6-й эканомікай Еўрапейскага саюза і 23-й эканомікай свету. Паводле даных студзеня 2022 года, у Польшчы налічваецца 964 гарады. Самымі буйнымі з'яўляюцца:

**1.** Варшава - 1 792 718 жыхароў.

Найбуйнейшы горад і сталіца Польшчы, адначасова важны палітычны, эканамічны, навуковы і культурны цэнтр. У Варшаве размешчаныя найважнейшыя дзяржаўныя ўстановы, у тым ліку, сядзібы Прэзідэнта, Сейма і Сената, Савета міністраў, Нацыянальны банк Польшчы, цэнтральныя офісы і міжнародныя інстытуты.

**2.** Кракаў - 780 796 жыхароў.

Кракаў - другі па велічыні горад у Польшчы. Будучы раней сталіцай, ён застаецца цэнтрам культуры і адукацыі. Тысячагадовая гісторыя горада прыцягвае турыстаў з усяго свету. За апошнія 20 гадоў Кракаў перажыў дынамічныя змены, надаючы асаблівую ўвагу ўстойліваму развіццю.

**3.** Лодзь – 667 923 жыхара.

Лодзь шырока вядомы прамысловы і культурны горад. У цэнтры горада ляжыць вуліца Пётркоўская, адна з самых доўгіх пешаходных зон сучаснай Еўропы. Уздоўж вуліцы Пётркоўскай знаходзяцца шматлікія архітэктурныя помнікі, якія адлюстроўваюць гісторыю горада, у тым ліку камяніцы ў стылі мадэрн, старыя заводы, рэзідэнцыі ўладальнікаў фабрык і шматлікія сінагогі. Сёння Лодзь - мегаполіс, які дынамічна развіваецца, знаходзіцца ў самым цэнтры краіны - усяго ў 1,5 гадзінах язды ад сталіцы.

**4.** Вроцлаў – 641 201 жыхар.

Размешчаны на рацэ Одэр і чатырох яе прытоках, Вроцлаў часта называюць Паўночнай Венецыяй. Нягледзячы на тое, што горад знаходзіцца ў прамысловай Сілезіі, ён лічыцца самым зялёным горадам у Польшчы - на аднаго жыхара прыпадае 25 м2 зялёных насаджэнняў.

**5.** Познань – 530 464 жыхара.

Горад, размешчаны ў цэнтральнай частцы Вялікапольскага ваяводства на рацэ Варта. Познань – гэта горад выдатнай музыкі, дзе, з аднаго боку, праводзяцца конкурсы класічнай музыкі, а з другога - дынамічна развіваецца польскі хіп-хоп. Адным з найбуйнейшых выставачных мерапрыемстваў у Еўропе з'яўляецца Познаньскі міжнародны кірмаш, які праводзіцца ў Познані.

**6.** Гданьск – 470 633 жыхара.

**7.** Шчэцін – 396 472 жыхара.

**8.** Быдгашч – 341 692 жыхара.

**9.** Люблін – 337 788 жыхароў.

**10.** Беласток – 296 401 жыхар.

## КУЛЬТУРА

Пяць палякаў атрымалі Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Першым быў выдатны пісьменнік **Генрык Сянкевіч,**які атрымаў прэмію ў 1905 г. за раман «Quo Vadis». Твор «Мужыкі» **Уладзіслава Рэймонта** быў ацэнены ў 1924 г. Два польскія паэты атрымалі Нобелеўскую прэмію за прыжыццёвыя дасягненні - **Чэслаў Мілаш** у 1980 г. і **Віслава Шымборска** у 1996 г. У 2019 г. Нобелеўскую прэмію па літаратуры таксама атрымала **Вольга Такарчук**.

Асаблівым перыядам у творчасці польскіх паэтаў і пісьменнікаў стаў перыяд рамантызму, які прыпадае на гады падзелаў, няволі, рэпрэсій і паўстанняў за незалежнасць. Менавіта ў гэты час стварaлі свае выдатныя творы **Адам Міцкевіч** («Пан Тадэвуш», «Дзяды», «Конрад Валенрод), **Юліюш Славацкі** («Кордзіян», «Баладына»), **Аляксандр Фрэдра** («Помста»), а таксама **Каміль Цыпрыян Норвід** і **Зыгмунт Красіньскі.** Рамантызм у Польшчы быў моцна звязаны з патрыятычнай плынню.

Сярод сусветнай эліты пісьменнікаў-фантастаў знаўцы жанру заўсёды згадваюць **Станіслава Лема**, навукова-фантастычныя творы якога бударажаць уяўленне чытачоў з 1950-х гадоў XX стагоддзя, а таксама **Анджэя Сапкоўскага**, чыя фэнтэзійная сага «Ведзьмак» і іншыя творы былі перакладзеныя амаль на дваццаць моў, а па матывах «Ведзьмака» былі створаныя папулярны тэлесерыял і кампутарная гульня (The Witcher).

Адным з самых значных кампазітараў-рамантыкаў, чые творы сталі класікай, вядомай і прызнанай ва ўсім свеце, з'яўляецца **Фрыдэрык Шапэн**. Свае першыя працы ён пачаў ствараць ва ўзросце сямі гадоў!

Польскія дзеячы кіно часта адзначаюцца ўзнагародамі ў галіне кінаматаграфіі. На сённяшні дзень палякі атрымалі больш за дзесяць «Оскараў» і амаль 30 намінацый. Сярод найбольш вядомых лаўрэатаў - рэжысёры: **Анджэй Вайда**, **Раман Паланскі**, **Павел Паўлікоўскі**, аператар **Януш Камінскі** і кампазітар **Ян Качмарэк**.

Да вядомых польскіх кампазітараў і музыкантаў варта аднесці **Вітольда Лютаслаўскага,** піяніста і кампазітара, узнагароджанага шматлікімі

нацыянальнымі і міжнароднымі прэміямі, **Уладзіслава Шпільмана,** піяніста яўрэйскага паходжання, які напісаў больш за 500 папулярных песень, у тым ліку шмат джазавых аранжыровак, і **Кшыштафа Эўгеніюша Пендэрэцкага,** выдатнага скрыпача і піяніста, уладальніка многіх прэмій «Грэмі» і ўзнагароды *«Самы выдатны кампазітар года»* на міжнародным музычным кірмашы Мідэм у 2000 годзе.

## НАВУКА

Самым выдатным польскім навукоўцам эпохі Адраджэння з'яўляецца стваральнік геліяцэнтрычнай тэорыі - **Мікалай Капернік**. У сваёй працы 1543 года «Аб кручэнні нябесных целаў» ён даказаў, што менавіта планеты круцяцца вакол Сонца, а не наадварот.

Варта таксама ўспомніць **Ігнацыя Лукасевіча,** вынаходніка парафінавай лямпы, піянера нафтавай прамысловасці ў Еўропе, польскага прадпрымальніка і фармацэўта, **Стэфана Банаха,** выдатнага матэматыка, заснавальніка функцыянальнага аналізу, **Яна Чохральскага**, хіміка і вынаходніка, стваральніка метаду атрымання монакрышталяў і першых еўрапейскіх гідраэлектрастанцый., і **Генрыха Арцтоўскага,** падарожніка і географа, які ўдзельнічаў у даследаванні «палярных» краін.

Адной з першых выдатных хімікаў і фізікаў у гісторыі навукі была полька, якая жыла ў Францыі, **Марыя Кюры-Складоўская**. Яна была адзінай жанчынай, якая атрымала Нобелеўскую прэмію двойчы. У 1903 годзе гэта была прэмія па фізіцы, а ў 1911 годзе — па хіміі.

## СПОРТ

Напэўна кожны футбольны заўзятар добра ведае **Роберта Левандоўскага,** капітана зборнай Польшчы па футболе і нападаючага іспанскага клуба «Барселона». Ён праславіўся тым, што забіў пяць галоў за дзевяць хвілін у матчы мюнхенскай «Баварыі» супраць «Вольфсбурга» ў 2015 годзе. Левандоўскі прызнаны самым выдатным польскім футбалістам з часоў **Казімежа Дэйны**, караля бамбардзіраў Мюнхенскай Алімпіяды 1972 года.

З улікам клімату і надвор'я ў краіне, палякі любяць зімовыя віды спорту. Таму яны асабліва ганарацца паспяховымі спартсменамі ў зімовых відах спорту. Вялікую цікавасць выклікаюць скачкі з трампліна з тых часоў, як **Адам Малыш** стаў трохразовым чэмпіёнам свету ў 2001, 2003 і 2007 гадах. Яго пераемнікам стаў **Каміль Стох**, у цяперашні час нацыянальны рэкардсмен і ўладальнік трох залатых алімпійскіх медалёў у 2014 і 2018 гадах. Сярод жанчын найбольш паспяховай з'яўляецца **Юстына Кавальчык**, лыжніца, двухразовая залатая медалістка Алімпійскіх гульняў 2010 і 2014 гадоў і чэмпіянату свету 2009 года.

Да самых папулярных спартоўцаў Польшчы можна таксама аднесціў **Аніту Ўладарчык**, якая двойчы здабыла алімпійскае золата ў кіданні молата ў 2012 і 2016 гадах і тройчы станавілася чэмпіёнкай свету ў 2009, 2015 і 2017 гадах, і **Агнешку Радваньскую,** чэмпіёнку Еўропы ў 2012, 2014 і 2016 гадах - найлепшую тэнісістку Польшчы і фіналістку Уімблдона Вялікага шлема ў адзіночным разрадзе ў 2012 годзе. Па яе слядах пайшла **Іга Свёнтэк**, першая полька, якая выйграла тытул Вялікага шлема і ўзначаліла спіс WTA.



## КЛІМАТ/ПОРЫ ГОДА

Польшча знаходзіцца ў пераходным умераным кліматычным поясе, які характарызуецца вялікай разнастайнасцю і зменлівасцю надвор'я. Улетку тэмпература вагаецца ад 18 °C да 30 °C у залежнасці ад рэгіёна. Зімой прыкладна ад 0 °C да ніжэй за -5 °C.

Сярэднегадавая тэмпература вагаецца ад звыш 9 °C да прыкладна 6 °C. У Польшчы вылучаюць чатыры пары года:

**Восень**

Пачынаецца 23 верасня.

Увосень дні скарачаюцца, і часта ідуць дажджы, але польская залатая восень можа захапіць любога. У гэты перыяд палякі любяць збіраць грыбы.

*Памятайце - восенню часта ідуць дажджы - надзеньце плашч і вазьміце з сабой парасон.*



**Зіма**

Пачынаецца 22 снежня.

Узімку звычайна холадна і ідзе снег, але гэта не спыняе палякаў, якія любяць зімовыя віды спорту — лыжы, сноўборд, а таксама катанне на каньках. Дзеці любяць катацца на санках і ляпіць снегавіка.

*Памятайце - зімой часта бывае холадна і марозна, тэмпература апускаецца ніжэй за 0°C* - надзеньце цёплы абутак і зімовую куртку.



**Вясна**

Пачынаецца 21 сакавіка.

Вясной дні становяцца даўжэйшымі, становіцца цяплей і сонечней. У добрае надвор'е палякі любяць гуляць, катацца на роварах і праводзіць час на свежым паветры.

Памятайце - вясной надвор'е часта пераменлівае - апраніце лёгкую куртку або талстоўку.



**Лета**

Пачынаецца 22 чэрвеня.

Лета - час адпачынку і аднаўлення. Падчас адпачынку палякі любяць ездзіць на мора, на возера ці на раку, а больш актыўныя займаюцца альпінізмам у гарах ці катаюцца на каноэ.

Памятайце - улетку цёпла і свеціць сонца - надзеньце зручны лёгкі абутак, бейсболку з казырком і кароткія штаны.



**Памятайце, што нельга есці незнаёмыя вам расліны і грыбы, якія не растуць у вашай краіне, - яны могуць нанесці шкоду здароўю і жыццю вам і вашым дзецям.**

## ПОЛЬСКІЯ НОРМЫ І ЗВЫЧАІ

Польшча з'яўляецца краінай з даўнімі хрысціянскімі традыцыямі, таму многія нормы і звычаі паходзяць ад гэтай рэлігіі. Некаторыя нормы ўжо назаўжды ўпісаліся ў існуючы правапарадак, іншыя ўяўляюць сабой узоры жаданых грамадскіх паводзін. Многія прынцыпы таксама вынікаюць з павагі да дэмакратыі і правоў чалавека.

**Роўнасць і забарона на дыскрымінацыю**

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Польшча, кожны грамадзянін Польшчы роўны перад законам. Польскі закон гарантуе свабоду выказвання сваіх поглядаў, перакананняў і палітычных сімпатый - ніхто не можа быць дыскрымінаваны з гэтай прычыны. Вы таксама павінны паважаць погляды і лад жыцця іншых людзей, таму важна не абражаць і не зневажаць нікога сваімі выказваннямі і паводзінамі, паколькі гэта можа пацягнуць прававыя наступствы.



Праява павагі да пажылых людзей з'яўляецца прыкметай добрага выхавання, таму ў грамадскім транспарце маладыя людзі павінны саступаць месца пажылым.

Жанчыны маюць такія ж правы, як і мужчыны. Многія жанчыны ў Польшчы працуюць і робяць прафесійную кар'еру. Таксама ўсё часцей жанчына працуе, а мужчына застаецца дома з дзецьмі, ці, прынамсі, яны пароўну дзеляць хатнія абавязкі. Аднак ёсць яшчэ сферы грамадскага жыцця і прафесіі, у якіх жанчынам больш цяжка прабіцца і дасягнуць поспеху. Часам мужчыны таксама адчуваюць дыскрымінацыю, бо лічаць, што закон больш абараняе правы жанчын. Пытанні гендарнай роўнасці па-ранейшаму застаюцца актуальнай тэмай як у спрэчках на польскіх кухнях, так і ў публічных дэбатах.



**Ахова навакольнага асяроддзя**

Адказнасць за прыроднае асяроддзе, якое пагаршаецца з прычыны дзейнасці чалавека, а таксама жаданне зменшыць колькасць утвараемых адходаў і садзейнічаць іх паўторнаму выкарыстанню (recycling) становіцца ўсё больш важным у заканадаўстве і ў свядомасці палякаў.

Штодзённай праявай такога падыходу з'яўляецца забарона на засмечванне, гэта значыць выкідванне смецця ў неадведзеных для гэтага месцах, за што можна атрымаць штраф. Усё большая ўвага надаецца і сегрэгацыі адходаў, гэта значыць збору адходаў у спецыяльна пазначаныя кантэйнеры з разбіўкай па відах матэрыялаў, з якіх яны выраблены.



### Перапрацоўка - асноўныя прынцыпы

| Папера | Шкло | Біяадходы | Металы і пластмасы | Змешаныя адходы |
|---|---|---|---|---|
| Выкідваем:<br>• упакоўку з паперы і кардону;<br>• газеты, часопісы, рэкламныя лістоўкі;<br>• сшыткі;<br>• офісную паперу; | Выкідваем:<br>• бутэлькі з-пад напояў і ежы;<br>• шкляныя банкі;<br>• шкляную ўпакоўку з-пад касметыкі; | Выкідваем:<br>• адходы гародніны і садавіны;<br>• харчовыя рэшткі;<br>• галінкі дрэў і кустоў;<br>• скошаную траву, лісце, кветкі;<br>• апілкі і кару дрэў; | Выкідваем:<br>• пластыкавыя бутэлькі;<br>• каўпачкі, пластыкавую ўпакоўку, поліэтыленавыя пакеты, кардонную ўпакоўку з-пад малака і напояў,<br>• упакоўку з-пад ачышчальных сродкаў; | Выкідваем:<br>• усё тое, што нельга выкідаць у іншыя кантэйнеры і што не з'яўляецца небяспечнымі адходамі;<br>• рэшткі мяса, костак, скуры;<br>• брудную паперу;<br>• адходы жывёльнага паходжання;<br>• звычайныя лямпачкі |
| Не выкідваем:<br>• гігіенічныя адходы, напрыклад, папяровыя ручнікі і выкарыстаныя сурвэткі;<br>• кардонную ўпауоўку з-пад малака і напояў;<br>• лакіраваную паперу;<br>• тлустую паперу;<br>• пялёнкі, брудную або мокрую макулатуру; | Не выкідваем:<br>• кераміку, гаршкі з-пад кветак, фарфор;<br>• шкло ад акуляраў і тэрмаўстойлівая шкло;<br>• свечкі з воскам;<br>• лямпачкі, люмінесцэнтныя лямпы і рэфлектары;<br>• упакоўку з-пад лекаў;<br>• люстэркі і ваконнае шкло; | Не выкідваем:<br>• зямлю і камяні;<br>• вугальны попел;<br>• апрацаваную насычэннем драўніну;<br>• косці і фекаліі жывёл | Не выкідваем:<br>• упакоўку з-пад лекаў;<br>• адпрацаваныя батарэйкі і акумулятары;<br>• банкі з-пад фарбаў;<br>• падгузнікі, сурвэткі;<br>• адзенне і тэкстыльную ўпакоўку; | Не выкідваем:<br>• пратэрмінаваныя лекі і хімікаты;<br>• адпрацаваныя электронныя і бытавыя прыборы;<br>• адпрацаваныя батарэйкі і акумулятары;<br>• адходы будаўніцтва і зносу;<br>• выкарыстаныя шыны<br>• рэшткі фарбаў і лакаў; |

### Здароўе

Найбольш бяспечным і эфектыўным спосабам абароны ад многіх небяспечных інфекцыйных захворванняў у Польшчы з'яўляецца вакцынацыя. Некаторыя з прышчэпак з'яўляюцца абавязковымі, і ўсе, хто жыве ў Польшчы, абавязаны іх прайсці, а некаторыя не з'яўляюцца абавязковымі, але рэкамендуюцца. Рэкамендаваныя прышчэпкі гэтак жа важныя, як і абавязковыя. Яны забяспечваюць больш шырокую абарону ад сур'ёзных інфекцыйных захворванняў, такіх як COVID-19. Усеагульная вакцынацыя дзяцей і падлеткаў у Польшчы прывяла да значнага зніжэння рызыкі захворванняў і ўскладненняў, у прыватнасці, дыфтэрыі, поліяміэліту, коклюшу, адзёру і гепатыту B. Дзякуючы ўсеагульнай абавязковай вакцынацыі колькасць людзей, прышчэпленых ад гэтых захворванняў, расце, а рызыка эпідэмій гэтых інфекцыйных захворванняў сярод насельніцтва зніжаецца.

Улічваючы дарагое лячэнне хвароб, выкліканых курэннем, Польшча, як і большасць краін ЕС, вядзе строгую палітыку адносна курэння. У грамадскіх месцах, напрыклад, на прыпынках або на вуліцы, забаронена курэнне і ўжыванне алкаголю. Курэнне таксама забаронена ў большасці рэстаранаў і клубаў. На працоўных месцах ліквідуюць курылкі — адзіныя месцы ў будынках, дзе можна было курыць.

Аб надзвычайнай эпідэміялагічнай сітуацыі, як у выпадку пандэміі COVID-19, і аб уведзеных абмежаваннях і забаронах вы будзеце праінфармаваныя па месцы знаходжання і ў сродках масавай інфармацыі. Для вашай ўласнай бяспекі, а таксама бяспекі пражываючых і персаналу цэнтра і іншых людзей трэба выконваць дзейсныя санітарна-гігіенічныя патрабаванні, рэкамендацыі і парады, напрыклад: закрываць рот і нос маскамі, дэзінфіцыраваць рукі, захоўваць сацыяльную дыстанцыю, праходзіць вакцынацыю.

**Памятайце, што прышчэпкі таннейшыя за лячэнне ўскладненняў інфекцыйных захворванняў, а абавязковыя прышчэпкі бясплатныя.**

**Вольны час**

Палякі лічацца народам, які любіць святкаваць, прывязаны да традыцый і захоўвае старыя звычаі. Святы мы адзначаем дома ў сямейным коле. Хоць мы ўсё часцей выкарыстоўваем некалькі святочных дзён запар для паездкі з сям'ёй на мора, зімой - у горы ці нават у экзатычнае падарожжа. У Польшчы выхаднымі днямі з'яўляюцца ўсе нядзелі і дзяржаўныя святы; акрамя таго, па суботах не працуе ніводная дзяржаўная ўстанова.

**Пунктуальнасць**

У Польшчы вялікае значэнне надаецца пунктуальнасці. Спазненне, асабліва па дзелавых пытаннях, лічыцца непрымальным і нават прыкладам дрэнных манер. Калі хтосьці прыйдзе на ўмоўленую сустрэчу ў дзяржаўную ўстанову або бальніцу са спазненнем, яго могуць не прыняць, і ён зноў павінен будзе запісацца на прыём. На працы за спазненне вы можаце атрымаць папярэджанне, а таксама меншае ўзнагароджанне. За пастаянныя спазненні вас могуць звольніць.

## ГАЛОЎНЫЯ ПОЛЬСКІЯ СВЯТЫ

**Вялікдзень сакавік - красавік** (паміж 21 сакавіка і 25 красавіка). **Вялікдзень** — самае старажытнае і важнае хрысціянскае свята, прысвечанае ўваскрашэнню Ісуса Хрыста. Вялікдзень з'яўляецца рухомым святам і адзначаецца ў першую нядзелю пасля першай веснавой поўні (паміж 21 сакавіка і 25 красавіка). Папярэдні тыдзень, на якім Касцёл і вернікі ўспамінаюць важнейшыя для хрысціянскай веры падзеі, называецца Вялікім тыднем.





**Каляды** (24 - 26 снежня) займаюць асаблівае месца ў польскай традыцыі. Гэта самае прыгожае і самае сямейнае свята ў годзе, з ім звязана найбольшая колькасць рытуалаў і павер'яў. Суправаджае іх магічная атмасфера, а таксама традыцыя, якая культывуецца пакаленнямі. Амаль у кожным польскім доме ў гэты выключны час не можа не быць ёлкі, аплатка (прэсны прэсаваны хлеб), супольных спеваў калядак, а таксама падарункаў.

**Іншымі святамі з'яўляюцца**:
1 студзеня - Новы год;
6 студзеня - Богаяўленне (Дзень Трох Каралёў);
1 мая - Дзень працы;
2 мая - Дзень Сцяга Рэспублікі Польшча;
3 мая - Дзень Канстытуцыі 3 мая;
Май/чэрвень - Дзень Святой Тройцы (Зялёныя Святы);
Май/чэрвень - Свята Цела і Крыві Хрыстовых (Корпус Крысці, Boże Ciało);
15 жніўня - Дзень Войска Польскага і Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі;
1 лістапада - Дзень усіх святых;
11 лістапада – Дзень незалежнасці;

**Варта памятаць, што ў гэтыя дні ўсе дзяржаўныя ўстановы і буйныя гандлёвыя цэнтры, а таксама большасць крамаў зачыненыя (акрамя 2 мая - гэта працоўны дзень).**

Акрамя таго, палякі адзначаюць таксама шэраг іншых святаў і сямейных урачыстасцей, такіх як хрысціны, першая прычасць, вяселле, імяніны і дні нараджэння.

## ПОЛЬСКАЯ КУХНЯ

Польская кухня багатая мяснымі стравамі, прыгатаванымі рознымі спосабамі. Асабліва вядомыя такія стравы, як бігас, свіная адбіўная, варэнікі і галубцы. Польская кухня шырока вядомая добрым хлебам і смачнымі вяндлінамі.

Асноўнымі прадуктамі, якія выкарыстоўваюцца ў традыцыйнай польскай кухні, з'яўляюцца бульба, квашаная капуста, буракі, агуркі, крупы, грыбы, розныя гатункі мяса.

Польская кухня запазычыла шмат страваў ад суседніх народаў; мы выкарыстоўваем шмат рэцэптаў, напрыклад яўрэйскай кухні. Польскае меню пастаянна папаўняецца новымі смакамі, часам нават экзатычнымі. Акрамя рэстаранаў, якія прапануюць стравы польскай кухні, ёсць шмат іншых, якія спецыялізуюцца на кухні азіяцкіх краін, італьянскіх, французскіх або амерыканскіх стравах.





## СУВЯЗЬ

**Мабільныя аператары**

Ніжэй прыведзены адрасы сайтаў папулярных сетак мабільнай сувязі. Там вы знойдзеце падрабязную інфармацыю аб актуальных цэнах на паслугі і дзеючых тарыфах.

- T-Mobile Polska www.t-mobile.pl
- Orange Polska www.orange.pl
- Plus www.plus.pl
- Play www.play.pl

Іншыя сеткі:

- Lycamobile www.lycamobile.pl/
- Klucz Telekomunikacja Sp. z o.o. www.klucz.net
- Nju Mobile  www.njumobile.pl
- Red Bull Mobile www.redbullmobile.pl/
- Heyah www.heyah.pl/
- Virgin Mobile Polska Sp. z o.o. www.virginmobile.pl

Пры набыцці SIM-карты з польскім тэлефонным нумарам неабходна заўсёды прад'яўляць пасведчанне асобы. Вы можаце выбраць варыянт з перадаплатай, варыянт з абанементам і змешаны варыянт.

**Інтэрнэт**

У многіх месцах гарадоў (кафэ, гандлёвыя цэнтры, вакзалы, кінатэатры і г.д.) і ва ўсіх міграцыйных цэнтрах у спецыяльна адведзеных месцах даступны бясплатны інтэрнэт **Wi-Fi**. Вы павінны спытаць у супрацоўнікаў месцаў, дзе вы знаходзіцеся, ці магчыма гэта і, калі неабходна, пароль доступу.



## ГРАМАДСКІ ТРАНСПАРТ

**Грамадскі транспарт** у Польшчы ўключае ў сябе:

- аўтобусы і мікрааўтобусы (у некаторых гарадах курсіруюць прыватныя аўтобусы і мікрааўтобусы) - заўсёды звяртайце ўвагу на тое, ці не з'яўляецца прыпынак, на якім вы хочаце выйсці, прыпынкам «па патрабаванню». Калі гэта так, вам трэба будзе націснуць адпаведную кнопку або іншым чынам паведаміць кіроўцу, што вы хочаце выйсці. Калі вы сядаеце на прыпынку «па патрабаванню», памахайце рукой кіроўцу пад'язджаючага да прыпынку аўтобуса;



- чыгуначны транспарт;
- трамваі, тралейбусы;
- метро (толькі ў Варшаве);
- самалёты – найбуйнейшыя польскія гарады маюць аэрапорты і сетку авіязносін паміж імі.

У Варшаве ёсць дзве лініі метро, якія злучаюцца на станцыі Świętokrzyska. Першая лінія праходзіць ад станцыі Kabaty (на поўдні) да станцыі Młociny (на поўначы). Другая лінія, якая яшчэ будуецца, цягнецца з захаду на ўсход горада. У цяперашні час яна адкрыта на маршруце Bemowo – Bródno, але ў канчатковым выніку павінна злучыць Karolin (ранейшыя Mory) і мікраараён Bródno. Плануецца будаўніцтва трэцяй лініі, якая павінна злучыць Нацыянальны стадыён з Гоцлавам.

**На ўсе віды транспарту трэба набыць білет.**

Білет не трэба набываць тым, хто мае правы на бясплатны праезд, гэта значыць дзецям да 4 гадоў і людзям з інваліднасцю I групы. Памер ільгот і скідак залежыць ад канкрэтных транспартных кампаній, таму пры набыцці білета лепш спытаць у касе, ці маеце вы правa на зніжку; напрыклад, у Варшаве дзеці з нараджэння да 30 верасня таго года, калі ім спаўняецца 7 гадоў, і людзі ва ўзросце 70 гадоў і старэй могуць ездзіць у грамадскім транспарце бясплатна, дзеці з 7 гадоў да 21 года пры прад'яўленні сапраўднага вучнёўскага білета (legitymacja szkolna) маюць права на 50% зніжку, як і студэнты да 26 гадоў пры прад'яўленні сапраўднага студэнцкага білета (legitymacja studencka).

У большасці гарадоў на грамадскім транспарце можна набыць разавыя білеты і білеты на час. Акрамя таго, можна сустрэць білетыі на адзін дзень, тыдзень, месяц ці на квартал.

Білеты можна набыць у газетных кіёсках, некаторых універсальных крамах, а часам і ў кіроўцаў, але ў гэтым выпадку ў вас павінна быць дакладная сума без рэшты.

У некаторых буйных гарадах білеты можна набыць у аўтаматах, якія стаяць на аўтобусных прыпынках, у метро і часам у аўтобусах і трамваях. Аўтаматы звычайна дапускаюць толькі адну форму аплаты - толькі картай або толькі наяўнымі, часта толькі манетамі. Аўтаматы выдаюць рэшту, такім чынам, не трэба мець дакладнай сумы. Акрамя таго, білеты на грамадскі транспарт можна набыць у мабільных праграмах, напрыклад, «Jak dojadę», «Skycash», «Mobilet», «Mpay» або «zBiletem» - некаторыя з гэтых праграм таксама даступныя на іншых мовах, акрамя польскай.





Чыгуначныя міжгародні білеты можна набыць у касах на вакзале або ў цягніку ў кандуктара, аднак у цягніку налічваецца дадатковая аплата і білеты даражэйшыя. Білеты на міжгародні аўтобусныя маршруты можна набыць у кіроўцы, а таксама ў касах. Часам білеты таксама можна набыць праз Інтэрнэт.

**Памятайце, што недастаткова проста набыць білет, яго яшчэ трэба прабіць у кампосцеры, які ёсць у транспартным сродку, або пагасіць ў мабільнай праграме на смартфоне. Наяўнасць сапраўднага білета падлягае кантролю. За праезд без білетаў або з несапраўднымі білетамі выпісваюцца вялікія штрафы, якія неабходна аплаціць. У Варшаве штраф за праезд без сапраўднага білета складае больш за 250 злотых.**

**Індывідуальны транспарт**

## Пасведчанне кіроўцы

Калі ў вас ёсць **сапраўднае** нацыянальнае пасведчанне кіроўцы, выдадзенае за мяжой, вы павінны абмяняць яго пасля 6 месяцаў знаходжання ў Польшчы.

Для абмену пасведчання кіроўцы, выдадзенага ў краінах, якія **не з'яўляюцца**:

- краінамі-удзельніцамі Канвенцыі аб дарожным руху, падпісанай у Жэневе 19 верасня 1949 г. (адносна міжнародных пасведчанняў кіроўцы),
- краінамі-удзельніцамі Канвенцыі аб дарожным руху, падпісанай у Вене 8 лістапада 1968 г. (адносна нацыянальных і міжнародных пасведчанняў кіроўцы),
- дзяржавай-членам Еўрасаюза, Швейцарыяй або дзяржавай-членам Пагаднення Еўрапейскага саюза аб свабодным гандлі (EFTA) - бокам дамовы аб Еўрапейскай эканамічнай зоне,

**неабходна здаць тэарэтычны экзамен у Польшчы!**

Пры абмене замежнага пасведчання кіроўцы захоўваецца арыгінал абменьваемага дакумента. За абмен пасведчання кіроўцы спаганяецца плата ў памеры каля 100,50 злотых, а сам абмен займае да 30 дзён. Больш падрабязную інфармацыю аб працэдуры абмену пасведчання кіроўцы і неабходных дакументах можна атрымаць у аддзелах транспарту гарадскіх адміністрацый або адміністрацый паветаў.

**Калі вы з'яўляецеся кіроўцам аўтамабіля, памятайце, што вам неабходна мець пры сабе:**

- сапраўдны дакумент, які сведчыць асобу;
- пасведчанне кіроўцы, якое адпавядае тыпу транспартнага сродку, якім вы кіруеце;
- пасведчанне аб рэгістрацыі з сапраўдным тэхаглядам;
- страхаванне аўтамабіля ОС.



Калі ў вас няма пры сабе гэтых дакументаў, паліцыя можа забраць дакументы на аўтамабіль і адбуксіраваць яго на ахоўваемую стаянку.

Калі вышэйуказаныя дакументы былі выдадзены ў Польшчы, і вы з'яўляецеся ўладальнікам аўтамабіля, якім кіруеце, вы не абавязаны мець іх пры сабе падчас праверкі, паколькі ўсе даныя знаходзяцца ў інфармацыйнай сістэме паліцыі. Аднак вы павінны мець пры сабе дакумент, які сведчыць асобу. Чакаючы рашэнне аб прадастаўленні міжнароднай абароны, вы павінны заўсёды мець пры сабе TZTC (Часовае пасведчанне асобы замежніка) - дакумент, які пацвярджае легальнасць вашага знаходжання ў Польшчы.

**Акрамя таго:**

- кіроўца і пасажыры падчас руху павінны быць прышпіленыя рамянямі бяспекі;
- дзеці ростам менш за 150 см павінны ездзіць у спецыяльных дазволеных дзіцячых крэслах;
- круглы год трэба ездзіць з уключанымі фарамі блізкага святла;
- хуткасць руху павінна адпавядаць дзеючым абмежаванням, указаным на прыдарожных знаках.



**УВАГА!!!**
**У Польшчы нельга кіраваць аўтамабілем у стане алкагольнага ап’янення. У Польшчы (на чэрвень 2022 г.) дапушчальнае ўтрыманне алкаголю ў выдыхаемым паветры складае да 0,10 мг/дм3,(0,2 праміле ў крыві).**

**Забарона на кіраванне ў нецвярозым стане строга захоўваецца. Суровасць пакарання за невыкананне правілаў залежыць ад утрымання алкаголю ў арганізме парушальніка, тыпу кіруемага транспартнага сродку і месца кіравання. У залежнасці ад гэтага, кіраванне пад уздзеяннем алкаголю можа ўяўляць сабой**

**(на чэрвень 2022 г.) ):**

- **адміністрацыйнае правапарушэнне (утрыманне алкаголю ў крыві ад 0,2 да 0,5 праміле), якое караецца 30 днямі турэмнага зняволення, штрафам да 5 000,00 злотых, пазбаўленнем правоў на тэрмін ад 6 месяцаў да 3 гадоў, або**
- **крымінальнае злачынства (утрыманне алкаголю ў крыві больш за 0,5 праміле), якое караецца штрафам да 60 000,00 злотых, абмежаваннем волі або пазбаўленнем волі да двух гадоў, забаронай на кіраванне да 15 гадоў.**



**У Польшчы часта праводзяцца дарожныя праверкі ўпаўнаважанымі органамі!**

**На дарогах усталявана многа фотарадараў, якія кантралююць хуткасць руху.**

**Парадак на дарогах кантралюе паліцыя, муніцыпальная паліцыя і Галоўная дарожна-транспартная інспекцыя.**

**Невыкананне правілаў пагражае высокімі штрафамі,**

**пазбаўленнем правоў кіроўцы і рэгістрацыйнага пасведчання, і нават турэмным зняволеннем!!!**

**Вы павінны разумець, што вам не будуць вернутыя сумы штрафаў, накладзеных за парушэнне правілаў, у тым ліку за адсутнасць білета або праезд з несапраўдным білетам.**

**Таксі**

Пры жаданні вы таксама можаце скарыстацца паслугамі таксі. **У Польшчы праезд на таксі нашмат даражэй,** чым на грамадскім транспарце. Аднак, калі вы вырашылі скарыстацца кампаніямі таксі, **варта памятаць, што:**

- на транспартным сродку павінен быць надпіс TAXI;
- на лабавым шкле аўтамабіля павінна быць інфармацыя аб цане за кіламетр праезду;
- кошт за 1 км вар’іруецца ў залежнасці ад месцазнаходжання, кампаніі таксі і тарыфу, і ў Варшаве складае ад 1,60 да 9 злотых за 1 км;
- калі вы заказваеце таксі па тэлефоне, кошт праезду будзе ніжэй, чым калі вы ўзялі таксі са стаянкі;
- вы можаце папрасіць кіроўцу ацаніць кошт вашага праезду;



- лепш пазбягаць транспартных сродкаў, на якіх напісана «перавозка людзей» («przewóz osób») - гэтыя кампаніі працуюць неафіцыйна;
- на вакзалах/аэрапортах бяспечней карыстацца тымі таксі, якія спыняюцца на вызначанай стаянцы таксі, і будзьце ўважлівыя да людзей, якія падыходзяць у зале прылёту ў аэрапорце і прапануюць таксі, якое прыпаркаванае ў іншым месцы, чым вызначаная стаянка таксі.

Памятайце, што многія кампаніі таксі спаганяюць так званы пачатковы тарыф. Кошт праезду залежыць ад месца, дня, часу і тарыфу. Папрасіце ў кіроўцы прэйскурант і ўдакладніце прыкладны кошт паездкі!

**Акрамя таго, у інтэрнэце вы можаце знайсці больш даступную інфармацыю і сайты параўнання коштаў на таксі, якія дапамогуць вам спланаваць паездку і выбраць самую танную кампанію таксі.**

**У Польшчы не прынята лавіць таксі узмахам рукі. Калі вы шукаеце свабодны аўтамабіль, вы можаце пашукаць паблізу прыпынак «TAXI». У цяперашні час усё больш папулярнымі становяцца мабільныя праграмы для тэлефонаў, з дапамогай якіх можна заказаць машыну і сачыць за яе маршрутам у рэжыме рэальнага часу (напрыклад, iTaxi, myTaxi, CAB4YOU і г. д.)**

Падобным і часта больш танным відам транспарту з'яўляюцца транспартныя паслугі, якія прапануюць Bolt і Uber. Спампуйце праграму для смартфона, каб знайсці бліжэйшага да вас кіроўцу. Пасля таго як кіроўца прыме ваш заказ, вы атрымаеце падрабязную інфармацыю, такую як прыблізны час чакання і інфармацыю аб аўтамабілі. У мабільнай праграме вы можаце выбраць спосаб аплаты: дэбетавая або крэдытная карта, Android Pay, PayPal або наяўнымі грашыма.

## Нумар PESEL (або Ўсеагульная электронная сістэма ўліку насельніцтва)

Нумар PESEL - гэта адзінаццацізначны лічбавы сімвал, які дазваляе лёгка ідэнтыфікаваць чалавека, у якога ён ёсць. Нумар PESEL змяшчае дату нараджэння, парадкавы нумар, абазначэнне полу і кантрольную лічбу. Хоць тэарэтычна наяўнасць нумара PESEL не з'яўляецца абавязковым для замежніка, некаторыя ўстановы могуць яго запатрабаваць.

У такой сітуацыі вы можаце атрымаць нумар PESEL 2 спосабамі:

1. Калі вы жывеце ў Польшчы, можна зарэгістравацца па месцы жыхарства, - у гэтым выпадку нумар PESEL будзе прысвоены аўтаматычна,
2. Калі вы не можаце зарэгістравацца, а якое-небудзь ведамства патрабуе ад вас наяўнасці нумара PESEL, можна падаць заяву з указаннем прававой падставы, якая абавязвае вас мець нумар PESEL (напрыклад, арт. 17с п. 1 і 2 Закона аб інфармацыйнай сістэме ў ахове здароўя).

Важна адзначыць, што атрыманне нумара PESEL з'яўляецца бясплатным.

Нумар PESEL таксама патрабуецца ў школах перад пачаткам абавязковай адукацыі. У гэтым выпадку пакажыце прававую аснову, якую назаве вам школа.

За дапамогай і падтрымкай пры запаўненні заявы можна звярнуцца да супрацоўнікаў міграцыйных цэнтраў або ў Аддзел абслугоўвання замежнікаў у Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33.




## БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА

На жаль, замежнікам адкрыць рахунак у банку больш складана, чым грамадзянам Польшчы. Кожны банк устанаўлівае свае правілы для замежнікаў, якія жадаюць адкрыць рахунак. Як правіла, замежнікі не маюць магчымасці адкрыць рахунак анлайн і абавязаныя мець пры сабе пасведчанне асобы (мінімум - пашпарт і пасведчанне на права жыхарства)

Падрабязную інфармацыю аб умовах адкрыцця рахунка і прапановах вы знойдзеце на сайтах банкаў.



# ПРАЦЭДУРА ПРАДАСТАЎЛЕННЯ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

## СХЕМА ПРАЦЭДУРЫ ПРАДАСТАЎЛЕННЯ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

можаце ўключыць у хадайніцтва сваіх непаўналетніх дзяцей, а таксама мужа або жонку пры ўмове іх пісьмовай згоды. Вы падаеце хадайніцтва праз каменданта аддзялення памежнай службы на мяжы або ў аэрапорце. Калі вы ўжо знаходзіцеся ў Польшчы, вы можаце падаць хадайніцтва на выбраным вамі пункце або аддзяленні памежнай службы.
Пасля таго як ваша хадайніцтва будзе прынята, памежная служба затрымае ваш праязны дакумент (пашпарт) і выдасць першае Часовае пасведчанне асобы замежніка (TZTC).

↓

Памежная служба павінна неадкладна - не пазней чым праз 48 гадзін пасля падачы - перадаць ваша хадайніцтва разам з праязным дакументам начальніку Упраўлення па справах замежнікаў.

↓

Рашэнне па вашай справе павінна быць вынесена на працягу 6 месяцаў або на працягу аднаго месяца, калі яна была перададзена на паскораную працэдуру. Аднак, калі ваша справа складаная, працэдура можа быць прадоўжана.

↓

Падчас разгляду вашага хадайніцтва ў вас ёсць магчымасць асабіста даць паказанні падчас так званага інтэрв'ю, а таксама прадставіць доказы таго, што ў вас ёсць падставы для звароту па міжнародную абарону. Вашу справу можа прадстаўляць упаўнаважаны прадстаўнік, вы таксама можаце свабодна звязвацца з прадстаўніком Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў і з арганізацыямі, якія прадастаўляюць юрыдычную дапамогу.

↓

Працэдура прадастаўлення міжнароднай абароны заканчваецца тым, што начальнік Упраўлення па справах замежнікаў выносіць адно з наступных рашэнняў.

↓

1. Рашэнне аб прадастаўленні статусу бежанца.
2. Рашэнне аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны.
3. Рашэнне аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны.
4. Рашэнне аб спыненні вядзення справы.
5. Рашэнне аб прызнанні хадайніцтва аб міжнароднай абароне непрымальным.

↓

Вы маеце права абскардзіць рашэнне начальніка Упраўлення па справах замежнікаў у Савеце па справах бежанцаў. Апеляцыя падаецца праз начальніка Упраўлення на працягу 14 дзён з моманту паведамлення аб прынятым рашэнні. Указаны тэрмін скарачаецца да 7 дзён, калі хадайніцтва разглядаецца па паскоранай працэдуры.

↓

Вы можаце абскардзіць рашэнне Савета па справах бежанцаў на працягу 30 дзён з моманту паведамлення аб прынятым рашэнні ў Ваяводскі адміністрацыйны суд праз Савет па справах бежанцаў (Al. Ujazdowskie 1/3, 00-583 Warszawa).

## ІНТЭРВ’Ю І ПРЫНЯЦЦЕ РАШЭННЯ

Вельмі важным момантам у разглядзе хадайніцтва аб статусе бежанца з’яўляецца інтэрв’ю. Інтэрв’ю нацэлена на высвятленне істотных фактаў для вырашэння вашай справы. Пасля інтэрв’ю вы атрымаеце копію пратакола інтэрв’ю.

З вамі не будзе праведзена інтэрв’ю, калі:

- вынясенне рашэння аб прадастаўленні статусу бежанца магчыма на падставе сабраных доказаў,
- у працэсе разгляду справы вы не можаце прысутнічаць на інтэрв’ю ці не можаце ў ім удзельнічаць па стане здароўя або па псіхалагічных прычынах.

1. З заяўнікам, які падаў хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны, праводзіцца гутарка (інтэрв’ю) без удзелу іншых асобаў, на прысутнасць якіх заяўнік не даў згоды. У гутарцы можа ўдзельнічаць прадстаўнік заяўніка. Гутарку праводзіць адпаведным чынам абучаны супрацоўнік Дэпартамента па справах бежанцаў Упраўлення па справах замежнікаў, якога, пры неабходнасці, суправаджае перакладчык мовы, указанай замежнікам у хадайніцтве, або псіхолаг.
2. Ведайце, што калі вы звяртаецеся па міжнародную абарону, вы знаходзіцеся пад спецыяльнай абаронай. **Уся інфармацыя, перададзеная вамі ў працэсе разгляду вашай справы, а таксама падчас інтэрв’ю, з’яўляецца канфідэнцыяльнай і ахоўваецца польскім заканадаўствам. Упраўленне па справах замежнікаў не перадае гэтую інфармацыю дзяржаўным органам і ўстановам, а таксама іншым магчамым вінаватым у праследаванні або прычыненні сур’ёзнай шкоды ў вашай краіне.**
3. Вы абавязаныя прадаставіць падчас інтэрв’ю ўсю інфармацыю, якая будзе патрэбная для разгляду вашага хадайніцтва. Падрабязныя адказы на задаваемыя пытанні карысныя для вас. Вы таксама абавязаныя перадаць існуючыя ў вас доказы (напрыклад, дакументы, сертыфікаты, кампакт-дыскі і г.д.), якія пацвярджаюць інфармацыю, прадастаўленую вамі ў хадайніцтве аб прадастаўленні міжнароднай абароны.
4. Інфармацыя, якую вы прадастаўляеце падчас інтэрв’ю, а таксама доказы вельмі важныя для вырашэння вашай справы. Яны ў поўнай меры ўлічваюцца пры прыняцці рашэння. **Утойванне інфармацыі і доказаў або прадастаўленне ілжывай інфармацыі і доказаў нявыгадна для вас і можа прывесці да адмоўнага рашэння па вашай справе.**



5. **Калі пасля інтэрв’ю з’явяцца новыя важныя абставіны справы або новыя доказы, вам належыць як мага хутчэй звярнуцца ў Дэпартамент па справах бежанцаў**. Вы таксама можаце хадайнічаць аб дадатковым інтэрв’ю або пісьмова папрасіць аб выкліку сведкі па вашай справе - у такім выпадку трэба паведаміць імя сведкі, яго хатні адрас, а таксама ўказаць, аб якой акалічнасці ён будзе сведчыць.

   Новую інфармацыю, доказы і хадайніцтвы можна перадаць у пісьмовай форме

   - на паштовы адрас: ul. Taborowa 33, 02-699 Варшава або
   - даставіць асабіста ў Канцылярыю UDSC (ul. Taborowa 33, 02-699 Warszawa).
6. Пасля разгляду вашага хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны вам будзе выдадзена рашэнне. Яно выдаецца ў пісьмовым выглядзе і дастаўляецца па адрасе, указанаму вамі ў якасці дзеючага месца жыхарства, праз паштовага аператара або ўпаўнаважанага супрацоўніка Упраўлення.

   **Памятайце аб абавязку інфармаваць Упраўленне аб кожным змяненні адраса для карэспандэнцыі**. Атрымаўшы рашэнне, вы абавязаныя яго выканаць. Кожнае рашэнне змяшчае інфармацыю на зразумелай вам мове, якая тлумачыць вынік разгляду справы, і інфармацыю аб магчымасці падачы апеляцыі.

## АДМЕНА ПРАЦЭДУРЫ ПРАДАСТАЎЛЕННЯ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

Гэта адбываецца, калі:

- вы падаеце заяву аб адкліканні хадайніцтва,
- вы не зверніцеся ў прыёмны цэнтр на працягу 2 дзён з дня падачы хадайніцтва або пасля вызвалення з ахоўваемага цэнтра або з-пад варты для замежнікаў, калі не ўкажаце ў хадайніцтве іншы адрас, па якім будзеце знаходзіцца;
- вы пакінеце міграцыйны цэнтр больш чым на 7 дзён без уважлівай прычыны;
- вы пакінеце тэрыторыю Рэспублікі Польшча;
- вы не з'явіцеся на інтэрв'ю і не зможаце даказаць на працягу 7 дзён з даты, прызначанай для інтэрв'ю, што няяўка была выкліканая абставінамі, за якія вы не несяце адказнасці;
- вы вызваленыя з ахоўваемага цэнтра або з-пад варты з мэтай высылкі і без дазволу начальніка Упраўлення пакідаеце вызначанае месца або месца знаходжання, прадпісанае яго рашэннем, а таксама не з'яўляецеся праз вызначныя прамежкі часу ў орган, указаны ў рашэнні;

Начальнік Упраўлення выдасць вам рашэнне аб адмене разгляду справы, калі адмена справы не супярэчыць грамадскім інтарэсам. Па вашай заяве, пададзенай на працягу 9 месяцаў з дня прыняцця рашэння аб адмене справы, рашэнне аб адмене справы страчвае сілу, і разгляд па справе аднаўляецца (дзеянні, прынятыя ў ходзе спыненай працэдуры, застаюцца ў сіле).



## НЕПРЫМАЛЬНАСЦЬ ХАДАЙНІЦТВА АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

Хадайніцтва можа быць прызнана непрымальным, калі:

- у вас ёсць міжнародная абарона ў іншай дзяржаве-члене ЕС;
- вы можаце быць прынятыя краінай, якая не ўваходзіць у ЕС, калі яна лічыцца для вас краінай першага прытулку;
- яно з'яўляецца чарговым хадайніцтвам аб прадастаўленні міжнароднай абароны, і заяўнікам не было прадстаўлена ні новых доказаў, ні фактычных або прававых абставінаў, якія значна павышаюць верагоднасць прадастаўлення міжнароднай абароны;
- вы далі згоду на тое, каб ваш сужэнец падаў хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны ад вашага імя, пасля чаго вы падалі асобнае хадайніцтва, калі не існуюць абставіны, якія апраўдваюць падачу вамі такога хадайніцтва.

## НАСТУПСТВЫ АДМОЎНАГА РАШЭННЯ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

Калі вы атрымалі рашэнне:

- аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і адмове ў прадастаўленні дадатковай абароны;
- аб прызнанні хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны непрымальным;
- аб спыненні разгляду справы аб прадастаўленні міжнароднай абароны;
- аб пазбаўленні статусу бежанца або дадатковай абароны.

**Вы абавязаныя пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча на працягу 30 дзён з дня, калі рашэнне стала канчатковым.**



## ТАК ЗВ. ДУБЛІНСКАЯ ПРАЦЭДУРА

Кожны замежнік старэйшы за 14 гадоў, які падае хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і палажэннямі рэгламента (ЕС) № 603/2013 Еўрапейскага парламента і Савета ад 26 чэрвеня 2013г. (так званы рэгламент Eurodac), **падлягае дактыласкапіі, гэта значыць зняццю адбіткаў пальцаў**.

Адбіткі пальцаў адпраўляюцца ў цэнтральны аддзел у Люксембургу для рэгістрацыі і праверкі таго, што вы раней не звярталіся за міжнароднай абаронай або што вы раней не пражывалі ў дзяржаве-члене ЕС.

Здача адбіткаў пальцаў з'яўляецца абавязковай умовай для пачатку разгляду справы аб прадастаўленні міжнароднай абароны.

Калі вы падалі сваё першае хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны ў Польшчы ў адпаведнасці з палажэннямі рэгламента (ЕС) № 604/2013 Еўрапейскага парламента і Савета ад 26 чэрвеня 2013г. (так зв. Рэгламент Дублін III), дзяржавай, адказнай за разгляд вашага хадайніцтва, з'яўляецца Польшча, паколькі яна з'яўляецца першай краінай Дублінскага рэгламента, у якую вы заехалі. Гэта азначае, што калі вы пакінеце тэрыторыю Польшчы і вырашыце падаць хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны ў іншай дзяржаве-члене ЕС, вас адправяць назад у Польшчу як краіну, кампетэнтную разглядаць ваша хадайніцтва.

Калі існуюць абставіны, якія апраўдваюць зварот Польшчы да іншай дзяржавы-члену ЕС з просьбай узяць на сябе адказнасць або забраць замежніка, робіцца адпаведны запыт. Да такіх абставінаў адносіцца, у тым ліку, знаходжанне ў сістэме Eurodac, наяўнасць візы або пасведчання на права жыхарства, выдадзенага іншай дзяржавай-членам, наяўнасць членаў сям'і ці сваякоў на тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў.

Калі ў вас ёсць члены сям'і ці сваякі на тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў ЕС, то ў вашых інтарэсах паведаміць пра гэта супрацоўніка пагранічнай службы ў працэсе прыняцця хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны і перадаць адпаведныя дакументы або даставіць іх без прамаруджвання ў Аддзел дублінскіх працэдур Дэпартамента па справах бежанцаў Упраўлення па справах замежнікаў, каб можна было пачаць так званую працэдуру ўз'яднання сям'і.

**Памятайце, што пры падачы ў Польшчы хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны вы абавязаныя заставацца на тэрыторыі Польшчы да завяршэння працэдуры з канчатковым рашэннем.**

## БЯСПЛАТНАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І ДАПАМОГА

### Бясплатная юрыдычная інфармацыя

Калі вы звярнуліся па міжнародную абарону ў Польшчы або калі ў дачыненні да вас вядзецца працэдура аб пазбаўленні вас статусу бежанца або дадатковай абароны, **вы маеце права на бясплатную юрыдычную інфармацыю** ў ходзе разгляду справы ў першай інстанцыі. Бясплатная юрыдычная інфармацыя заключаецца ў інфармаванні вас аб дзеючых прававых нормах па прадастаўленні міжнароднай абароны ў Польшчы, адмене статусу бежанца або дадатковай абароны.

**Бясплатную юрыдычную інфармацыю вам прадаставяць супрацоўнікі Дэпартамента па справах бежанцаў** у Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33 і ў г. Бяла-Падляска, ul. Dokudowska 19. разгляд хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны і адмене

### Бясплатная юрыдычная дапамога

Пры разглядзе апеляцыі вы маеце права на бясплатную юрыдычную дапамогу, уключаючы складанне апеляцыі на рашэнне начальніка Упраўлення па справах замежнікаў і юрыдычнае прадстаўніцтва. Для атрымання бясплатнай юрыдычнай дапамогі звярніцеся да адваката, юрысконсульта або ва ўпаўнаважаную НДА.

Больш падрабязную інфармацыю і спіс адвакатаў, юрысконсультаў і ўпаўнаважаных няўрадавых арганізацый можна знайсці на сайце **https://www.gov.pl/web/udsc/bezplatna-pomoc-prawna**

Варта таксама памятаць, што ўся неабходная інфармацыя аб правілах прадастаўлення дапамогі замежнікам размешчаная на дошках аб’яваў/інфармацыі на тэрыторыі міграцыйных цэнтраў на мовах, зразумелых для пражываючых. Да такой інфармацыі, у прыватнасці, адносяцца правілы знаходжання ў цэнтры, інфармацыя аб працэдуры прадастаўлення міжнароднай абароны, спіс арганізацый, якія прадастаўляюць бясплатную юрыдычную дапамогу і іншыя формы дапамогі замежнікам.



# САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА

**ФОРМЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ, ЯКІЯ ХАДАЙНІЧАЮЦЬ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ Ў ПОЛЬШЧЫ**

- Размяшчэнне ў міграцыйным цэнтры для замежнікаў, якія хадайнічаюць аб прадастаўленні міжнароднай абароны.
- Грашовая дапамога для самастойнага пакрыцця выдаткаў на знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча (г. зн. грашовая дапамога па-за цэнтрам).

Незалежна ад таго, жывеце вы ў адным з міграцыйных цэнтраў або карыстаецеся дапамогай па-за цэнтрам, вы маеце права на:

- Бясплатны доступ да медыцынскай дапамогі.
- Бясплатнае навучанне польскай мове, арганізаванае ў цэнтры, і асноўныя матэрыялы, неабходныя для навучання.
- Забеспячэнне неабходнымі сродкамі навучання, а таксама, па магчымасці, кампенсацыю выдаткаў на правядзенне пазашкольнай, аздараўленчай і спартыўна-масавай работы з дзецьмі.
- Пакрыццё выдаткаў на праезд для ўдзелу ў працэдуры прадастаўлення міжнароднай абароны, наведвання ўрача і ў іншых абгрунтаваных выпадках.
- Дапамогу ў арганізацыі пераезду ў іншую краіну, адказную за разгляд хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны (Дублін III).
- Дапамогу ў арганізацыі і фінансаванні выдаткаў на пахаванне

## ПАМЕР ГРАШОВАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПА-ЗА МІГРАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРАМ

Сацыяльная дапамога можа быць прадастаўлена ў выглядзе грашовай дапамогі для самастойнага пакрыцця выдаткаў на знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, калі гэта неабходна па арганізацыйных прычынах або неабходна для:

- забеспячэння бяспекі замежніка, з асаблівай увагай да становішча адзінокіх жанчын;
- аховы грамадскага парадку;
- абароны і падтрымання сямейных сувязей;
- падрыхтоўкі замежніка да самастойнага жыцця за межамі цэнтра пасля атрымання рашэння аб прадастаўленні статусу бежанца або рашэння аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца, у якім была прадастаўлена дадатковая абарона.

*ТАБЛІЦА: У адпаведнасці з пастановай міністра ўнутраных спраў ад 11 сакавіка 2016 года памер дапамогі залежыць ад колькасці чалавек у сям'і:*

| Колькасць членаў сям'і | Штодзённая сума на чалавека | Штомесячная сума на чалавека |
|---|---|---|
| **1 чалавек** | 25 злотых | 750 злотых |
| **2 чалавека** | 20 злотых | 600 злотых |
| **3 чалавека** | 15 злотых | 450 злотых |
| **4 чалавека** | 12,50 злотых | 375 злотых |

Калі вы хочаце атрымаць гэтую форму дапамогі, неабходна падаць заяву на атрыманне грашовай дапамогі для самастойнага пакрыцця выдаткаў на знаходжанне на тэрыторыі Рэспублiцы Польшча, у Дэпартамент сацыяльнай дапамогі UDSC па адрасе ul. Taborowa 33, 02-699 Warszawa. Узоры заяў можна атрымаць у супрацоўніка цэнтра або спампаваць з сайта Упраўлення па справах замежнікаў: **https://www.gov.pl/web/udsc/wnioski-do-pobrania**

## ПАМЕР ГРАШОВАЙ ДАПАМОГІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў МІГРАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРЫ



**Аб'ём дапамогі ў цэнтры ўключае ў сябе:**

- пражыванне;
- паўнадзённае калектыўнае харчаванне ў адпаведнасці з культурнымі нормамі пражываючых;
- пастаянную фінансавую дапамогу ў выглядзе так званых «кішэнных грошай» - 50 злотых у месяц (памер кішэнных грошай можа быць павялічаны да 100 злотых, калі замежнік выконвае дадатковую працу для цэнтра);
- пастаянную грашовую дапамогу на набыццё сродкаў асабістай гігіены – 20 злотых у месяц;
- аднаразовую грашовую дапамогу на набыццё адзення і абутку – 140 злотых;
- грашовы эквівалент замест харчавання– памер эквіваленту 11 злотых на чалавека за кожны дзень.

## ПРАЖЫВАННЕ

Сацыяльная дапамога даступная любому замежніку, які звярнуўся за міжнароднай абаронай у Польшчы, за выключэннем сітуацый, указаных у Законе аб прадастаўленні міжнароднай абароны замежнікам. На працягу двух дзён пасля падачы хадайніцтва аб прадастаўленні абароны замежнікам неабходна з'явіцца на рэгістрацыю ў адзін з двух прыёмных цэнтраў Дэпартамента сацыяльнай дапамогі, якія знаходзяцца ў гарадах Бяла-Падляска і Падкова-Лесьна-Дэмбак.

Пасля рэгістрацыі ў цэнтры вам будзе прадастаўлена месца ў пакоі, дзе вы можаце захоўваць свае асабістыя рэчы. Будзьце асабліва ўважлівыя да рэчаў, якія маюць для вас вялікую каштоўнасць.

У першы ж дзень вы атрымаеце **сухі правіянт**, а з наступнага дня харчаванне будзе ажыццяўляцца

ў сталовай (сняданак, абед і вячэра). Харчаванне, якое выдаецца ў сталовай, ўлічвае рэлігійныя і культурныя нормы.

У прыёмным цэнтры вы атрымаеце:

- ручнік,
- сталовыя прыборы,
- посуд,
- камплект пасцельнай бялізны.

Пакідаючы прыёмны цэнтр, вы павінны здаць гэтыя прадметы.

У цэнтрах ёсць кухні з плітамі і месцамі для гатавання ежы. У цэнтрах ёсць пральні, абсталяваныя пральнымі машынамі і сушылкамі, пакоі для адпачынку і вывучэння польскай мовы і малітоўныя пакоі.

## ПЕРАВОД У ІНШЫ ЦЭНТР

Пасля завяршэння працэдуры эпідэміялагічнай фільтрацыі вас перавядуць у іншы цэнтр.

**Вы не маеце ніякага ўплыву на выбар цэнтра, у які вас перавядуць.** Выключэннем з'яўляецца сітуацыя, калі ў іншым цэнтры **у цяперашні час** знаходзіцца ваша **бліжэйшая сям'я – браты і сёстры, сужэнец, дзеці, бацькі.** У іншых выпадках выбар цэнтра вызначаецца Дэпартаментам сацыяльнай дапамогі Упраўлення па справах замежнікаў.

Такі ж прынцып прымяняецца і ў дачыненні да магчымасці пераводу з аднаго цэнтра пражывання ў іншы. Рашэнне ў гэтым выпадку, пасля разгляду ўсіх абставін, прымае Дэпартамент сацыяльнай дапамогі Упраўлення па справах замежнікаў. Ніжэй указаны месцы знаходжання міграцыйных цэнтраў.

**Карта Польшчы з размяшчэннем цэнтраў**



## МЕДЫЦЫНСКІЯ АГЛЯДЫ

**Перад паступленнем у цэнтр вы абавязаны прайсці медыцынскі агляд** – для гэтага вы павінны з'явіцца ў медыцынскі пункт. Медыцынскія агляды праводзяцца для праверкі стану вашага здароўя. Медагляды ўключаюць наступныя медыцынскія працэдуры:

- ранняе выяўленне, дыягностыка і накіраванне на лячэнне туберкулёзу (рэнтген груднoй клеткі);
- ранняе выяўленне, дыягностыка і накіраванне на лячэнне інфекцыйных, венерычных і паразітарных захворванняў (аналіз крыві).

**Калі вы не пройдзеце медагляд, вы не атрымаеце дапамогу ў цэнтры, а толькі дапамогу за межамі цэнтра (вы будзеце атрымліваць 1/2 грашовай дапамогі).**

**Вынікі медагляду з'яўляюцца канфідэнцыяльнымі. Доступ да іх маеце толькі вы і медыцынскі персанал. Супрацоўнікі цэнтра не маюць доступу да медыцынскай дакументацыі.**

**Медыцынскія дакументы аб першасным аглядзе перадаюцца ў медыцынскі пункт таго цэнтра, у які вы будзеце пераведзеныя з прыёмнага цэнтра.**



## МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА

Падчас працэдуры аб прадастаўленні міжнароднай абароны вам забяспечваецца базавае медыцынскае абслугоўванне, якое з'яўляецца ідэнтычным бясплатнаму медыцынскаму абслугоўванню для грамадзян Польшчы (за выключэннем санаторна-курортнага лячэння і санаторнай рэабілітацыі). Лячэнне, якое выходзіць за рамкі базавага пакета медыцынскіх паслуг, кожны, як паляк, так і замежнік, павінен фінансаваць самастойна.

**Базавая медыцынская дапамога аказваецца ў медыцынскіх пунктах у цэнтрах і ў медыцынскім пункце, размешчаным па адрасе Упраўлення па справах замежнікаў - ul. Taborowa 33 у Варшаве. Кансультацыі і лячэнне ў паліклініках і бальніцах, а таксама абавязковая імунізацыя дзяцей і падлеткаў праводзяцца па накіраванню ўрача цэнтра або медыцынскага пункта па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве і з'яўляюцца бясплатнымі.**

**Замежныя грамадзяне, якія карыстаюцца паслугамі па-за цэнтрам, атрымліваюць медыцынскую дапамогу праз каардынатара па рэгістрацыі пацыентаў медыцынскага аператара па тэлефоне гарачай лініі 22 112 02 06 ад панядзелка па пятніцу з 8:00 да 16:00. Каардынатар назначае зручную дату і месца, дзе будзе прадастаўляцца паслуга.**

**Бясплатны пераклад медыцынскай дакументацыі**

Калі ў вас ёсць медыцынскія дакументы, важныя для вашага лячэння і складзеныя на іншай мове, пакажыце іх свайму ўрачу. Калі ўрач палічыць гэтыя дакументы неабходнымі для далейшага лячэння, кампанія па аказанню медыцынскіх паслуг зробіць іх пераклад за свой кошт.

- Калі вы адчулі сябе дрэнна, звярніцеся ў медыцынскі пункт, дзе вам акажуць адпаведную дапамогу і выдадуць бясплатныя лекі.
- Калі ваш стан патрабуе кансультацыі або спецыялізаванага лячэння, вы атрымаеце **накіраванне ад урача ў цэнтры або ў медыцынскім пункце па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве** да адпаведнага спецыяліста. **Звяртацца трэба толькі ў тую паліклініку або бальніцу, якая будзе ўказана ў накіраванні, памятаючы пра дату і час назначанага візіту.**

**Пераклад падчас візіту да ўрача.**

**Упраўленне не забяспечвае пераклад пры наведванні ўрачоў.**

Калі ў вас няма магчымасці наведаць урача з кімсьці, хто дапаможа вам у зносінах з урачом, папрасіце аб дапамозе медперсанал ў цэнтры ці медпункце па адрасе ul. Taborowa 33 або паведаміце пра гэта на гарачую лінію медыцынскага аператара.

Медыцынскі аператар за свой кошт забяспечвае прысутнасць перакладчыка пры аказанні медыцынскай або псіхалагічнай дапамогі пры ўзнікненні цяжкасцей у зносінах.

- Калі вы звернёцеся ў паліклініку або бальніцу без накіравання або ў паліклініку, не ўказаную ў накіраванні, **вы павінны будзеце аплаціць лячэнне самастойна,**
- **З рэцэптам і дакументамі, атрыманымі ад урача-спецыяліста, з'явіцеся ў медпункт ў цэнтры або ў медпункт па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве. Там выдаюцца бясплатныя лекі.**
- **Калі вы жывеце за межамі цэнтра, вы можаце рэалізаваць свой рэцэпт, даслаўшы яго па электроннай пошце па адрасе: cudzoziemcy@petramedica.pl. У паведамленні трэба ўказаць наступныя даныя: імя, прозвішча, кантактны тэлефон, дакладны адрас пражывання, па якім будуць адпраўленыя лекі. Калі вы набываеце лекі самастойна, вы можаце падаць заяву на вяртанне сродкаў. Для гэтага трэба адправіць медыцынскаму апаратару па пошце на адрас Petra Medica Sp. z o.o. ul. Grochowska 166, 04-329 Warszawa наступныя дакументы: заяву з просьбай аб вяртанні сродкаў на набыццё лекаў, якая змяшчае асабістыя даныя (імя, прозвішча, адрас, тэлефон), ксеракопію рэцэпту, рахунак на набытыя лекі, выпісаны на імя пакупніка: Petra Medica Sp z o.o., ul. Grochowska 166, 04-329 Warszawa, NIP 113 24 63 074, ксеракопію дакумента, які сведчыць асобу. Медыцынскі аператар пасля атрымання поўнага пакета дакументаў кампенсуе вам выдаткі на набыццё лекаў паштовым пераводам на ўказаны вамі адрас.**
- **У выпадку стаматалагічнай дапамогі таксама** спачатку неабходна атрымаць накіраванне ад урача ў цэнтры або медыцынскім пункце па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве, а затым звярнуцца ў паліклініку, указаную ў накіраванні. Як і ў выпадку з медыцынскай дапамогай, асобы, якія пражываюць за межамі цэнтра, афармляюць усе фармальнасці для свайго візіту па тэлефоне гарачай лініі 22 112 02 06.
- Псіхалагічныя кансультацыі не патрабуюць накіравання. Псіхалагічную дапамогу можна атрымаць у кожным міграцыйным цэнтры і ў Аддзеле абслугоўвання замежнікаў у Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33. Для асобаў, якія пражываюць за межамі цэнтра, месца і дату кансультацыі назначае каардынатар медыцынскага аператара па тэлефоне гарачай лініі 22 112 02 06.
- На прыём да **спецыялістаў** вы павінны прыходзіць **своечасова**. **У неназначаны час вы не будзеце прынятыя.**

У выпадку **раптоўнай хваробы або рэзкага пагаршэння здароўя,** у працоўныя дні з 18.00 да 8.00 і кругласутачна ў суботу, нядзелю і святочныя дні медыцынская дапамога аказваецца ў форме начнога і святочнага лячэння ў агульнадаступных медыцынскіх установах на тэрыторыі ўсяго краю.

Медыцынская дапамога ў начны час і ў святочныя дні аказваецца бясплатна і без накіравання. Спіс асобных медустаноў, якія аказваюць дапамогу ў начны час і ў святы па месцы жыхарства, можна знайсці на сайце www.petramedica.pl і на сайтах ваяводскіх аддзелаў Нацыянальнага фонду аховы здароўя.

У выпадку **раптоўнай пагрозы здароўю і жыццю,** якая патрабуе неадкладных медыцынска-выратавальных мерапрыемстваў, замежнікі карыстаюцца агульнадаступнай на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **Дзяржаўнай сістэмай неадкладнай медыцынскай дапамогі.** Каб выклікаць брыгаду хуткай дапамогі, тэлефануйце па нумарах экстранай дапамогі: **999** або **112.**

Калі вы хворыя і вам патрэбна медыцынская дапамога, звярніцеся да ўрача, які працуе ў цэнтры, або ў **медыцынскі пункт па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве, можна таксама патэлефанаваць на гарачую лінію медыцынскага аператара па тэлефоне: 22 112 02 06.**



**Схема медыцынскага агляду**

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| Урач вас агледзіць. | Урач назначыць лячэнне. | Урач выпіша лекі (бясплатна). | Урач выпіша накіраванне да вузкага спецыяліста або на аналізы. |

Не забывайце заўсёды прытрымлівацца ўказанняў урача. Прымайце лекі ў адпаведнасці з

Сачыце за датай візіту, вы можаце запісаць яе ў свой каляндар. Паклапаціцеся, каб не спазніцца на агляд. Калі вы бачыце праблемы, напрыклад, з транспартам, спытайце ў супрацоўніка цэнтра, як іх вырашыць

- Перыяд чакання прыёму ў спецыяліста ў Польшчы даволі працяглы, таму варта цярпліва чакаць і абавязкова прыйсці ў назначаны час.
- Прасачыце за тым, каб медыцынскія дакументы, якія тычацца вашага здароўя, паступілі да ўрача вашага цэнтра. Урач у цэнтры ці медпункце па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве будзе назіраць за вашым лячэннем.
- Памятайце, што першаснае медыцынскае абслугоўванне бясплатна для вас і вашай сям'і.
- Калі вы атрымліваеце паслугі за межамі цэнтра, вам неабходна звязацца з каардынатарам рэгістрацыі пацыентаў медыцынскага аператара па тэлефоне гарачай лініі 22 112 02 06 ад панядзелка па пятніцу з 8:00 да 16:00. Каардынатар назначае зручную дату і месца, дзе будзе прадастаўляцца паслуга.

## ХАРЧАВАННЕ



Харчаванне, якое выдаецца ў сталовай, улічвае рэлігійныя і культурныя нормы.

У залежнасці ад цэнтра, каб атрымаць харчаванне ў сталовай, дастаткова прад'явіць пасведчанне асобы, назваць нумар свайго пакою або загадзя атрымаць талон на харчаванне, які выдаецца супрацоўнікам цэнтра ад панядзелка па пятніцу ва ўстаноўленыя гадзіны. У пятніцу выдаюцца талоны на пятніцу, суботу і нядзелю. Вы павінны атрымліваць талоны асабіста пасля прад'яўлення пропуску.

Калі вы вегетарыянец, вам трэба паведаміць пра гэта супрацоўніку цэнтра, а калі ваш стан здароўя патрабуе спецыяльнага прыгатавання ежы, вам трэба паведаміць пра гэта ўрачу цэнтра, які выдасць даведку аб тым, якой дыеты вам трэба прытрымлівацца, калі ён палічыць гэта неабходным. Даведку трэба прад'явіць супрацоўніку цэнтра для замовы адпаведнага харчавання.

## ГРАШОВЫ ЭКВІВАЛЕНТ

**Калі вы знаходзіцеся ў цэнтры з дзіцем:**

- да 6 гадоў,
- якое з'яўляецца вучнем пачатковай або сярэдняй школы,

**вы маеце права на грашовы эквівалент замест харчавання.**

Каб атрымаць эквівалент, вы павінны да пэўнай даты прадаставіць даведку, якая пацвярджае, што ваша дзіця прынятае ў школу.

**Ваша дзіця мае права на атрыманне грашовага эквівалента замест харчавання, толькі калі ён/яна з'яўляецца вучнем школы.**

Грашовы эквівалент таксама можа быць прызначаны, калі гэтага патрабуюць арганізацыйныя меркаванні.

Грашовы эквівалент выплачваецца ў адпаведнасці з наступнымі правіламі:

- вы будзеце атрымліваць грошы да 15 чысла кожнага месяца;
- за кожны дзень месяца вы атрымаеце 11 злотых;
- пры атрыманні грошай вы павінны мець пры сабе TZTC і пропуск.

Грошы на дзяцей могуць атрымаць толькі бацькі.



## ВЯРТАННЕ КОШТУ БІЛЕТАЎ

**У абгрунтаваных выпадках вы можаце звярнуцца за вяртаннем сродкаў за праезд у грамадскім транспарце (не таксі).** Калі вы патрацілі грошы на праезд:

- для ўдзелу ў працэдуры прадастаўлення міжнароднай абароны,
- для праходжання медыцынскага агляду або вакцынацыі,
- у іншых асабліва абгрунтаваных выпадках,



Навучэнцы сярэдніх школ таксама могуць прэтэндаваць на пакрыццё кошту білетаў для праезду ў школу на грамадскім транспарце.

Для гэтага вы павінны:

Збіраць білеты, звязаныя з вышэйуказанымі паездкамі ў выпадку:

Калі вы паехалі да ўрача або ў бальніцу для агляду зарэгістраваць дзіця — Прыкладзіце копію накіравання

Калі ваша дзіця едзе ў сярэднюю школу ў грамадскім транспарце — Прыкладзіце заяву на вяртанне кошту, школьную даведку

Калі вы паехалі да інтэрв'ю, па павестцы ў UdSC, — Прыкладзіце копію павесткі з пацвярджэннем ад адпаведнага арганізацыйнага падраздзялення UdSC аб вашай яўцы на сустрэчу, ксеракопію

Аддайце дакументы супрацоўніку цэнтра, у якім вы знаходзіцеся, або ў Аддзел абслугоўвання замежнікаў у Варшаве, або адпраўце іх па адрасе: Departament Pomocy Socjalnej, ul. Taborowa 33, 02-699 Warszawa, калі вы жывеце за межамі цэнтра.

Супрацоўнік верне вам кошт білетаў або вы атрымаеце кампенсацыю паштовым пераводам, калі жывеце за межамі цэнтра.

**Памятайце:**

- Білеты павінны быць пракампасціраваныя.
- Дата ў білеце павінна адпавядаць даце павесткі, накіравання, агляду і інш.
- Вы павінны перамешчацца на грамадскім транспарце (кошт таксі не вяртаецца).

**Важна: паездкі на WKD (Варшаўская прыгарадная чыгунка) па маршруце Отрембусы-Варшава (Otrębusy-Warszawa) для асоб, якія праходзяць працэдуру прадастаўлення статусу бежанца, бясплатныя. Падчас праезду трэбаа мець пры сабе сапраўднае TZTC.**

## БЯСПЕКА Ў МІГРАЦЫЙНЫХ ЦЭНТРАХ

Упраўленне па справах замежнікаў прымае меры, каб забяспечыць вам належны ўзровень бяспекі падчас знаходжання ў міграцыйным цэнтры. У кожным цэнтры за вашай бяспекай сочаць кваліфікаваныя супрацоўнікі службы бяспекі, якія працуюць кругласутачна і без выхадных. **У любой сітуацыі, калі хтосьці вам пагражае, ужывае да вас насілле або калі вы баіцеся за сваю бяспеку, вы можаце звярнуцца за дапамогай да:**

- Супрацоўнікаў службы бяспекі;
- Супрацоўнікаў Упраўлення;
- Паліцыі - асабіста звярнуцца ў любое падраздзяленне паліцыі, а таксама патэлефанаваць па нумарах экстраных службаў 997 і 112;
- фондаў, якія аказваюць юрыдычную дапамогу, або
- да Нацыянальнай экстранай службы для ахвяр сямейнага насілля «Блакітная лінія» - па тэлефоне 800 120 002 або па электроннай пошце niebieskalinia@niebieskalinia.info.

Аб любых сітуацыях, звязаных з бяспекай у цэнтры і вакол яго, г.зн. аб насіллі, сямейным насіллі і ў дачыненні да дзяцей, бойках, пагрозах, знішчэнні маёмасці, захоўванні забароненых прадметаў, захоўванні і ўжыванні забароненых рэчываў (алкаголь, псіхатропныя прэпараты, наркотыкі), варта абавязкова паведамляць супрацоўнікам службы бяспекі або супрацоўнікам Упраўлення.



Парадак функцыянавання міграцыйных цэнтраў, а таксама **правы і абавязкі асобаў, якія пражываюць у іх, вызначаюцца правіламі знаходжання ў міграцыйным цэнтры і Законам аб прадастаўленні абароны замежнікам на тэрыторыі Рэспублікі Польшча. Кожны, хто пражывае ў цэнтры, абавязаны выконваць правілы, а таксама просьбы і распараджэнні супрацоўнікаў службы бяспекі.**

**Паўнамоцтвы супрацоўнікаў службы бяспекі**

Супрацоўнікі службы бяспекі маюць права аддаваць распараджэнні аб падтрыманні парадку і прад'яўленні пасведчання асобы, кантраляваць уваход, выхад і рух аўтатранспарту ў цэнтры, прымяняць меры прамога прымусу, уключаючы фізічную сілу, уваходзіць у жылыя памяшканні.

## ВЫХАД З ЦЭНТРА

**Усе цэнтры, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Упраўлення па справах замежнікаў, з'яўляюцца адкрытымі для пражываючых.** Таму вы можаце выходзіць з цэнтра з 6.00 да 23.00. **Вы павінны вярнуцца ў цэнтр да 23:00.**

Калі вы пакінеце цэнтр больш чым на **2 дні**, вы будзеце выключаныя са спісу пражываючых у цэнтры і пазбавіцеся сацыяльных дапамог і медыцынскага абслугоўвання. Калі праз гэты час вы захочаце вярнуцца ў цэнтр, вас не пусцяць і накіруюць у адзін з прыёмных міграцыйных цэнтраў, якія знаходзяцца ў гарадах Падкова-Лесьна-Дэмбак і Бяла-Падляска. Толькі калі вы звернецеся ў прыёмны цэнтр, вы зможаце аднавіць атрыманне сацыяльнай дапамогі.

**Пакідаючы аб'ект, вы абавязаны:**

- пакінуць свой пропуск у супрацоўнікаў службы бяспекі,
- пакінуць ключ ад займаемага пакоя/памяшкання ў супрацоўнікаў службы бяспекі,
- мець пры сабе сапраўднае TZTC (Часовае пасведчанне асобы замежніка), якое пацвярджае вашу асобу і легальнае знаходжанне ў Польшчы. Дакумент TZTC - гэта ваш дакумент, які сведчыць асобу і які неабходна прад'явіць па патрабаванню супрацоўніка паліцыі, памежнай службы або іншых упаўнаважаных органаў.



## ПРАВЫ ПРАЖЫВАЮЧЫХ У ЦЭНТРЫ

Вы маеце права:

- карыстацца памяшканнямі і аб'ектамі агульнага прызначэння (гульнявая пляцоўка, агульны пакой, тэлевізійны пакой, пральня, сушыльны пакой),
- карыстацца прадметамі, якія прадастаўляюцца супрацоўнікамі цэнтра (напрыклад, кнігамі, слоўнікамі, спартыўным інвентаром, бытавой тэхнікай і г. д.),



- атрымліваць базавую інфармацыю аб працэдуры прадастаўлення статусу бежанца і дакладную інфармацыю аб сацыяльнай дапамозе,
- атрымліваць інфармацыю аб добраахвотным вяртанні,
- атрымліваць пастаянную карэспандэнцыю аб прадастаўленні міжнароднай абароны і сацыяльнай дапамогі,
- на наведванні сваякамі і прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый пасля атрымання папярэдняга дазволу начальніка Упраўлення на ўваход у цэнтр,
- на наведванні замежнікаў, якія атрымліваюць сацыяльную дапамогу і не з'яўляюцца пражываючымі ў цэнтры, са згоды супрацоўніка цэнтра,
- карыстацца паслугамі псіхолага, які працуе ў цэнтры,
- удзельнічаць у мерапрыемствах і сустрэчах, арганізаваных на тэрыторыі цэнтра супрацоўнікамі і няўрадавымі арганізацыямі,
- падаваць на роднай мове скаргі і просьбы аб умовах знаходжання і працы цэнтра,
- на захаванне звычаяў, нацыянальных і культурных традыцый і выкананне рэлігійных абрадаў.

## АБАВЯЗКІ ПРАЖЫВАЮЧЫХ У ЦЭНТРЫ

Вашы абавязкі:

- сачыць за ўласнымі дзецьмі і не пакідаць іх без нагляду,
- падтрымліваць чысціню і парадак у пакоі, у якім жывеце, а таксама ў месцах агульнага карыстання цэнтра, у тым ліку, выносіць смецце ў кантэйнер (пакідаць смецце ў ваннай або на кухні забаронена),
- клапаціцца аб даручаных вам рэчах (пасцельнай бялізне, посудзе і г.д.), якія вы павінны здаць, перш чым пакінуць цэнтр,
- прытрымлівацца начной цішыні, якая дзейнічае з 22.00 да 6.00.



## ЗАБАРОНЫ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ ЦЭНТРА

Забараняецца:

- курыць па-за адведзенымі месцамі,
- захоўваць і ўжываць на тэрыторыі цэнтра алкаголь і алкагольныя напіткі, а таксама наркатычныя рэчывы і іх вытворныя,
- ужываць насілле у дачыненні да членаў сям'і, а таксама да іншых асобаў, у адпаведнасці з польскім заканадаўствам, за гэта пагражае крымінальная адказнасць,
- парушаць спакой іншых пражываючых у цэнтры,
- запісваць і фатаграфаваць іншых людзей,
- размяшчаць у сябе людзей, якія не з'яўляюцца пражываючымі ў цэнтры,



- выкарыстоўваць дадатковыя награвальныя прыборы, якія не адносяцца да абсталявання цэнтра,

## ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА І ІНШЫЯ РЫЗЫКІ

Любая асоба, якая заўважыла пажар або іншыя небяспекі ў памяшканнях, абавязаная захоўваць спакой, не ўпадаць у паніку і неадкладна праінфармаваць:

- людзей, якія знаходзяцца паблізу ад пажару або іншай небяспекі,
- кіраўніка цэнтра, супрацоўнікаў Упраўлення, супрацоўнікаў службы бяспекі,
- Дзяржаўную пажарную службу (тэл. 998 або 112),
- і актываваць пажарную сігналізацыю, націснуўшы кнопку ручнога выкліку.
- наносіць шкоду маёмасці цэнтра і іншых пражываючых у цэнтры.

**Інструкцыі па пажарнай бяспецы размешчаныя па ўсім цэнтры каля ўнутраных гідрантаў на лесвічных клетках. Азнаёмціся з імі адразу ж пасля размяшчэння ў жылым памяшканні, каб ведаць, як дзейнічаць у надзвычайнай сітуацыі.**

Аб выяўленні багажу, пакетаў, прадметаў невядомага паходжання, пакінутых без нагляду, або аб асобах з незвычайнымі паводзінамі, якія кідаюцца ў вочы, заўсёды трэба паведамляць супрацоўнікам службы бяспекі і Упраўлення. Да такіх прадметаў нельга дакранацца, іх нельга браць у рукі і самавольна адкрываць - яны павінны ахоўвацца спецыялістамі.

## ЗЛАЧЫНСТВЫ - ШТО ЗАБАРОНЕНА Ў ПОЛЬШЧЫ

У Польшчы вялікае значэнне надаецца выкананню законаў і дзеючых правілаў грамадскага парадку і сацыяльнага суіснавання. **Кожны чалавек мае роўныя правы незалежна ад узросту, гендэрнай ідэнтычнасці, сексуальнай арыентацыі, мовы, рэлігіі або краіны паходжання.** Крыніцамі агульнаабавязковага права ў Польшчы з'яўляюцца: Канстытуцыя, законы, ратыфікаваныя міжнародныя пагадненні, пастановы і акты мясцовага права.

**У Польшчы забаронена, між іншым:**

- Ужыванне насілля і незаконных пагроз (арт. 119 §1 Крымінальнага кодэкса);
- Ужыванне сямейнага насілля (арт. 207 Крымінальнага кодэкса);
- Удзел у бойцы або збіцці, пры якіх жыццё або здароўе чалавека падвяргаюцца небяспецы (арт. 158 §1 Крымінальнага кодэкса);
- Распальванне нянавісці на аснове нацыянальных, расавых або этнічных адрозненняў (арт. 256 §1 Крымінальнага кодэкса);
- Парушэнне спакою, грамадскага парадку, начнога адпачынку, (арт. 51 Кодэкса аб правапарушэннях);
- Незаконнае прысваенне чужой рухомай маёмасці або крадзеж (арт. 119 §1 Кодэкса аб правапарушэннях);
- Набыццё маёмасці, ведаючы, што яна з'яўляецца скрадзенайм або незаконна прысвоенай, садзейнічанне ў яе збыце або яе прыняцце ці садзейнічанне ў яе ўтойванні з мэтай атрымання фінансавай выгады (арт. 122 Кодэкса аб правапарушэннях);
- Ужыванне алкаголю ў грамадскіх месцах, уключаючы вуліцы, плошчы, паркі, грамадскі транспарт, на тэрыторыі школ і падчас масавых сходаў, за выключэннем спецыяльна адведзеных месцаў (рэстараны і бары) (арт. 14 §1 Закона аб выхаванні ў цвярозасці);
- Захоўванне, незаконнае абарачэнне і распаўсюджванне наркотыкаў, напрыклад, шляхам пачастунку або схілення да іх ўжывання (арт. 58, 59, 62, 63 Закона аб процідзеянні наркаманіі);
- Кіраванне транспартным сродкам асобамі, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення, пасля ўжывання алкаголю або наркатычных сродкаў, якія дзейнічаюць аналагічна алкаголю (арт. 45 §1 Закона аб дарожным руху).

**Паўнамоцтвы паліцыі**

Паліцэйскі мае права **запатрабаваць прад'яўленне пасведчання асобы** ў выпадках, калі ідэнтыфікацыя асобы неабходная для выканання службовых абавязкаў. У выпадку ўзнікнення абгрунтаванага падазрэння ў здзяйсненні злачынства або правапарушэння паліцыя **таксама мае права правесці асабісты надгляд і агледзець багаж.** Па магчымасці асабісты надгляд павінна праводзіць асоба таго ж полу. **Памятайце, што пры выхадзе з цэнтра вы заўсёды павінны мець пры сабе сапраўднае пасведчанне асобы - TZTC.**

Супрацоўнік паліцыі пры выкананні любых дзеянняў абавязаны назваць сваё званне, а таксама імя і прозвішча. Супрацоўнікі паліцыі без формы дадаткова абавязаныя прад'яўляць сваё службовае пасведчанне такім чынам, каб зацікаўленая асоба магла прачытаць і запісаць даныя супрацоўніка.

Паліцыя мае права затрымаць падазраваемую асобу, калі ёсць абгрунтаванае падазрэнне, што

яна здзейсніла злачынства, і пры гэтым ёсць пагроза, што гэта асоба можа ўцячы ці схавацца, або сцерці сляды злачынства, або асоба злачынцы не можа быць ўстаноўлена. **Затрыманы павінен быць вызвалены, як толькі будуць устаноўленыя прычыны затрымання, максімум праз 48 гадзін.** Калі пракурор звяртаецца ў суд з хадайніцтвам аб папярэднім зняволенні, затрыманы павінен быць дастаўлены ў суд на працягу 48 гадзін. На вынясенне рашэння суд мае 24 гадзіны.

Затрыманы мае права:

- неадкладна звязацца з адвакатам і пагаварыць з ім напрамую;
- патрабаваць паведаміць названай ім асобе аб затрыманні;
- падаць скаргу на затрыманне.

## НАСІЛЛЕ

**Ужыванне насілля ў Польшчы з'яўляецца парушэннем закону. Усе спрэчкі і праблемы павінны вырашацца па ўзаемнай згодзе, між іншым, праз размову.**

**Сексуальнае і гендэрнае насілле - гэта насілле, накіраванае супраць чалавека з-за яго полу, гендэрнай ідэнтычнасці або сексуальнай арыентацыі** – уключае дзеянні, якія наносяць шкоду пацярпеламу і прычыняюць фізічныя або псіхічныя пакуты. Гендэрнае насілле можа быць фізічным або псіхалагічным і прымаць форму насілля ў сям'і і з боку інтымнага партнёра, эканамічнага насілля, эмацыянальнага насілля, фізічнага насілля, сексуальнага насілля і злачынстваў на глебе нянавісці. Шкодныя культурныя практыкі і звычаі, у тым ліку калечанне праз аперацыі на жаночых палавых органах, прымусовыя або дзіцячыя шлюбы і гандаль людзьмі з'яўляюцца недапушчальнымі праявамі сексуальнага насілля.

### Хатняе (сямейнае) насілле

Адным з найбольш распаўсюджаных прыкладаў насілля з'яўляецца насілле ў сям'і - аднаразовыя або паўторныя **наўмысныя дзеянні або бяздзеянне, якое парушае правы або асабістыя інтарэсы бліжэйшых асобаў (членаў сям'і), у прыватнасці, стварае небяспеку страты жыцця або здароўя гэтых асобаў, прыніжае іх годнасць, цялесную недатыкальнасць, свабоду, уключаючы сексуальную свабоду, якое наносіць шкоду іх фізічнаму або псіхічнаму здароўю, а таксама якое прычыняе пакуты і маральную шкоду.** Хатняе насілле мае месца, калі член вашай сям'і прычыняе вам шкоду, не паважае вас, ігнаруе вашыя погляды, зрывае на вас злосць.

Вылучаюць розныя віды насілля:

- **фізічнае насілле** – прамыя дзеянні з прымяненнем сілы – біццё рукой, нагамі або прадметамі, выспяткі, удушванне, штурханні, аплявухі;
- **псіхалагічнае насілле** – ужыванне пагроз, насмешак, ганьбы, прыніжэння, шантажу, пастаяннай крытыкі;
- **эканамічнае насілле** – поўная фінансавая залежнасць ахвяры ад злачынца, адбіранне грошай, адмова ў задавальненні патрэбаў сям'і, утойванне прадуктаў харчавання;
- **сексуальнае насілле** – прымушэнне да розных тыпаў непажаданых паводзінаў з мэтай задавальнення сексуальных патрэбаў злачынцы – калі нехта прымушае да сексуальных дзеянняў, якіх вы не хочаце (таксама ў шлюбе).

**Калі вы сталі ахвярай насілля, у тым ліку хатняга насілля, - ПАКЛАПАЦІЦЕСЯ ПРА СЯБЕ, НЕ БОЙЦЕСЯ ГАВАРЫЦЬ - ЗАЯВІЦЕ АБ ХАТНІМ НАСІЛЛІ супрацоўнікам цэнтра, службы бяспекі або паліцыі - ЗАКОН - ВАШ САЮЗНІК - у вас ёсць поўнае права на абарону і дапамогу.**



З 30 лістапада 2020 года Польшча ўзмацніла заканадаўства па абароне асобаў, якія падвяргаюцца хатняму насіллю. Калі вы выклікаеце паліцыю **з прычыны таго, што блізкі чалавек ужывае насілле супраць вас ці вашых дзяцей, паліцыя мае права запатрабаваць ад парушальніка неадкладна пакінуць месца вашага сумеснага пражывання або забараніць яму набліжацца да гэтага месца** і яго бліжэйшага асяроддзя.

Гэта азначае, што парушальнік павінен будзе неадкладна пакінуць ваш пакой і цэнтр! Яму будзе забаронена вяртацца мінімум на працягу 14 дзён. На працягу гэтага часу вы можаце звярнуцца ў суд з просьбай вынесці пастанову аб тым, што асобе, якая наносіць вам шкоду, больш ніколі не дазваляецца набліжацца да вашага дому і бліжэйшага асяроддзя. Суд павінен прыняць рашэнне па гэтым пытанні не пазней чым праз 30 дзён. Вы можаце папрасіць, каб на час разгляду справы парушальнік па-ранейшаму не падпускаўся да месца вашага сумеснага пражывання.

**Цэнтр для адзінокіх жанчын і маці-адзіночак**

Улічваючы патрэбы адзінокіх жанчын і маці-адзіночак, Упраўленне па справах замежнікаў падрыхтавала ў міграцыйным цэнтры ў горадзе Падкова-Лесьна-Дэмбак асобную секцыю, якая будзе служыць месцам для адзінокіх жанчын і маці-адзіночак. Яна таксама прызначаная для ахвяраў хатняга насілля, якія жывуць асобна ад парушальніка. Доступ мужчын у гэтую частку цэнтра абмежаваны, а дадатковая псіхалагічная падтрымка і тэрапія дапамогуць вам пераадолець траўматычны вопыт.

Калі вы паведаміце пра выпадак хатняга насілля, парушальнік будзе ад вас аддзелены. Акрамя таго, **вы можаце выказаць жаданне пераехаць з дзецьмі ў іншы пакой, іншы цэнтр або месца для адзінокіх жанчын і маці-адзіночак, а таксама падаць заяву на атрыманне грашовай дапамогі для самастойнага пакрыцця выдаткаў на знаходжанне на тэрыторыі.**

**Грашовая дапамога ў выпадку неабходнасці забеспячэння бяспекі**

Калі гэта неабходна для вашай бяспекі, аховы грамадскага парадку або абароны і падтрымання сямейных сувязей, вам можа быць прадастаўлена грашовая дапамога для самастойнага пакрыцця выдаткаў на знаходжанне на тэрыторыі.

У гэтым выпадку вы пакінеце цэнтр і атрымаеце фінансавыя сродкі, якія дадуць магчымасць вам аплаціць уласнае жыллё і жыць за межамі цэнтра ўдалечыні ад небяспекі. **Больш падрабязна гл.: САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА**

## АБАРОНА ДЗЯЦЕЙ

Улічваючы неабходнасць асаблівай абароны дзяцей, Упраўленне па справах замежнікаў у супрацоўніцтве з Фондам «Dajemy Dzieciom Siłę» прыняло і ўкараніла «Палітыку абароны дзяцей ад жорсткага абыходжання ў міграцыйных цэнтрах», якая ўведзена ва ўсіх міграцыйных цэнтрах, - **калі вы хочаце азнаёміцца з дакументам цалкам, звярніцеся да супрацоўніка цэнтра.** Дакумент устанаўлівае стандарты і працэдуры паводзін, накіраваныя на:

- павышэнне дасведчанасці аб важнасці абароны дзяцей ад усіх формаў жорсткага абыходжання;
- давядзенне інфармацыі і вызначэнне парадку дзеянняў і круга абавязкаў ва ўсіх мерапрыемствах па забеспячэнню бяспекі дзяцей;



- забеспячэнне бяспекі дзяцей з дапамогай прэвентыўных дзеянняў, накіраваных на навучанне ў галіне абароны правоў дзяцей і мінімізацыю рызыкі жорсткага абыходжання з дзецьмі, а таксама дзеянняў па ўмяшанню з мэтай прыняцця адпаведных мер пры падазрэнні або прычыненні шкоды дзіцяці.

У Польшчы асаблівае значэнне надаецца забеспячэнню бяспекі дзяцей, іх належнаму выхаванню і догляду. Бацькі маюць бацькоўскую ўладу над дзіцем, пакуль яму не споўніцца 18 гадоў. Непаўнагадовы, які знаходзіцца пад бацькоўскай уладай, абавязаны слухацца сваіх бацькоў, але **бацькоўская ўлада павінна ажыццяўляцца такім чынам, як таго патрабуюць дабрабыт дзіцяці і грамадскія інтарэсы.**

Дабрабыт дзіцяці і грамадскія інтарэсы патрабуюць, сярод іншага: **каб дзіця атрымала адпаведную адукацыю, кваліфікацыю, падрыхтоўку да функцыянавання ў групе, да жыцця ў грамадстве.** Таму дзіця, апроч іншага, павінна наведваць школу і атрымліваць абавязковую адукацыю належным чынам, а бацькі павінны кантраляваць выкананне гэтага абавязку і супрацоўнічаць са школай. Невыкананне абавязку атрымання школьнай адукацыі з'яўляецца парушэннем Кодэкса аб сям'і і апецы, паколькі бацькоўская ўлада не ажыццяўляецца належным чынам.

Калі суд у ходзе разбіральніцтва ўстановіць, што ў сям'і ажыццяўляецца неналежны догляд за дзіцем і яго дабрабыт знаходзіцца пад пагрозай, ён можа прызначыць сям'і апекуна, які будзе ажыццяўляць кантроль за апекай над дзіцем, або абмежаваць бацькоўскія правы або пазбавіць іх - у гэтай сітуацыі дзіця будзе перададзена на апеку апекуна або змешчана ў спецыяльную ўстанову, напрыклад, дзіцячы дом.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ ШЛЮБУ ПАМІЖ НЕПАЎНАЛЕТНІМІ АСОБАМІ

**У адпаведнасці з польскім заканадаўствам, нарматыўныя акты не дапускаюць заключэнне і рэгістрацыю шлюбу непаўналетніх — асобаў, якія не дасягнулі 18 гадоў**. Шлюб можа быць заключаны толькі двумя **паўналетнімі асобамі** перад супрацоўнікам ЗАГСа або прадстаўніком рэлігійнай абшчыны, з якой Рэспубліка Польшча мае міжнароднае пагадненне.

Адзіным выключэннем з'яўляецца выпадак, калі суд па справах непаўналетніх дазваляе шлюб, але:

- толькі жанчыне, якая дасягнула 16 гадоў, і больш за тое
- ёсць важкія прычыны для заключэння такога шлюбу,
- а з абставінаў вынікае, што заключэнне шлюбу будзе адпавядаць інтарэсам ствараемай сям'і.

Звяртаем увагу, што суд **не абавязаны даваць** згоду на такі шлюб,а толькі **можа** гэта зрабіць. Шлюб, заключаны ў адпаведнасці, напрыклад, з мусульманскім рэлігійным абрадам, **не мае юрыдычнай сілы** у святле польскага права.

Згода бацькоў непаўналетняй дачкі на шлюб, напрыклад, паводле мусульманскага абраду, можа быць расцэненая польскім судом як неналежнае выкананне або невыкананне бацькоўскіх абавязкаў. Калі суд прызнае, што дабрабыт дачкі знаходзіцца пад пагрозай, ён можа прызначыць сям'і апекуна, які будзе сачыць за выхаваннем дачкі, або абмежаваць бацькоўскія правы і пазбавіць іх - у такой сітуацыі дзіця будзе перададзена на апеку апекуна або змешчана ў спецыяльную ўстанову, напрыклад, дзіцячы дом.

**Мужчына, які, паводле традыцыйнага права, ажаніўся на дзяўчынцы, якая не дасягнула 15 гадоў, і ўступіў з ёй у сексуальныя адносіны, учыняе злачынства і падлягае судоваму пераследу. Яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін ад 2 да 12 гадоў.**

Непаўналетняя, якая нарадзіла дзіця, не можа прымаць рашэнне аб яго лёсе. Гэта звязана з тым, што яна сама знаходзіцца пад бацькоўскай уладай сваіх бацькоў. Мужчына, які паводле польскага заканадаўства не з'яўляецца мужам маці, таксама не лічыцца бацькам дзіцяці, пакуль ён не прызнае дзіця сваім перад кіраўніком ЗАГСа або пакуль не будзе вынесена судовае рашэнне па гэтай справе. Такім чынам, за дзіця, якое нарадзілася ў выніку такіх адносін, няма каму адказваць з пункту гледжання закона, таму суд прызначае яму апекуна. Часцей за ўсё апекунамі выступаюць бацькі маці дзіцяці. Калі суд палічыць неабходным, ён можа перадаць дзіця на выхаванне, гэта значыць у дзіцячы дом (магчымая сітуацыя, калі дзіця забіраюць у непаўналетняй маці).

На непаўналетніх, якія прыехалі ў Польшчу з бацькамі, распаўсюджваецца бацькоўская ўлада маці і бацькі да дасягнення імі паўналецця. Няма магчымасці раз'яднаць бацькоўскую ўладу маці і бацькі, і нават пасля традыцыйнага шлюбу дзяўчына застаецца пад апекай сваіх бацькоў і

падпарадкоўваецца бацькоўскай уладзе і рашэнню, якое прымуць бацькі.

Калі бацькі непаўналетняй вырашаюць пакінуць тэрыторыю Польшчы і пакінуць сваю непаўналетнюю дачку з «мужам», яна будзе разглядацца як непаўналетняя, якая засталася без апекі, і будзе змешчаная ў дзіцячы дом. Адзіным выключэннем з'яўляецца выпадак, калі непаўналетняя дасягае 16 гадоў і са згоды суда ўступае ў шлюб у ЗАГСе. **З моманту заключэння шлюбу, згодна з польскім заканадаўствам, дзяўчына лічыцца паўналетняй,** таму яе справа вылучаецца ў асобны разгляд.

## АДУКАЦЫЯ

У Польшчы ўсе дзеці, у тым ліку замежныя, ва ўзросце ад 7 да 18 гадоў абавязаныя хадзіць у школу і вучыцца. Дзеці ва ўзросце 6 гадоў абавязаныя прайсці адзін год дашкольнай падрыхтоўкі (так званае дашкольнае навучанне - zerówka). Дзеці з 7 гадоў павінны наведваць пачатковую школу да моманту яе заканчэння або дасягнення 18-гадовага ўзросту. Пасля заканчэння пачатковай школы і да дасягнення 18 гадоў дзіця павінна атрымліваць абавязковую адукацыю ў сярэдняй школе. Рашэнне аб прыёме ў школу / дашкольную ўстанову прымае дырэктар школы. Аднак калі дзіця не праходзіць абавязковую адукацыю і не наведвае школу, на бацькоў могуць быць накладзеныя прававыя наступствы, такія як:

- узбуджэнне справы ў судзе і, як следства, накладанне штрафу;
- прызначэнне судом апекуна (куратара);
- у некаторых сітуацыях абмежаванне або пазбаўленне бацькоўскіх правоў.

Калі вы з'яўляецеся бацькам дзіцяці ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў, вы абавязаныя запісаць сваё дзіця ў бліжэйшую школу. Запытайце ў супрацоўніка цэнтра, як гэта зрабіць. Дзецям прадастаўляюцца падручнікі і школьныя прылады або ваўчар на іх набыццё. Падручнікі для дзяцей пачатковай школы вы атрымаеце ў школе, будзьце з імі акуратныя і не забудзьце іх вярнуць пры пераездзе. Пра падручнікі для сярэдняй школы і «zerówek « запытайце супрацоўніка цэнтра.

Бацькі самастойна набываюць сваім дзецям страхавы поліс у школе, што з'яўляецца добраахвотным, як і ўзносы ў бацькоўскі камітэт і г.д. Варта ўнесці нават невялікую суму на гэтыя мэты - з гэтых сродкаў аплачваюцца паездкі, арганізацыя мерапрыемстваў для дзяцей і г. д.

Дзеці, якія наведваюць школу, атрымліваюць грашовы эквівалент замест харчавання. Мы рэкамендуем бацькам набываць абеды ў школьнай сталовай для сваіх дзяцей (кошт - некалькі дзясяткаў злотых у месяц, якія вы можаце пакрыць з грашовага эквіваленту замест харчавання).

Пажадана, каб ваша дзіця наведвала заняткі па польскай мове ў цэнтры, што дапаможа яму ў вучобе ў школе. Для дзяцей, якія нядаўна прыбылі ў Польшчу, арганізуюцца спецыяльныя заняткі, якія



падрыхтуюць і аблегчаць пачатак іх навучання і зносін на польскай мове.

Многія школы праводзяць дадатковыя заняткі па вывучэнню польскай мовы і кампенсацыйныя курсы для замежных дзяцей. Дзеці, якія маюць патрэбу ў падтрымцы ў інтэграцыі і адукацыі, могуць наведваць падрыхтоўчае аддзяленне. Запытайце ў дырэктара школы або ў свайго класнага кіраўніка, якія дадатковыя заняткі праводзяцца ў школе. Даведайцеся, ці ёсць у школе памочнік па культуры, які размаўляе на вашай роднай мове.

Калі ваша школа арганізуе экскурсіі або выезды ў розныя месцы адпачынку, якія трэба аплачваць, вы можаце звярнуцца да дырэктара Дэпартамента сацыяльнай дапамогі з просьбай аб выдзяленні дадатковых сродкаў на іх пакрыццё. Рашэнне аб прадастаўленні фінансавання будзе залежаць ад бягучых фінансавых магчымасцей Упраўлення.

Калі вы пакідаеце цэнтр, таму што атрымліваеце грашовую дапамогу за межамі цэнтра або змяняеце цэнтр, - паведаміце аб гэтым школе, якую наведвае ваша дзіця. Запісваючы дзіця ў новую школу, укажыце назву папярэдняй школы. Не забудзьце вярнуць падручнікі, якія атрымала ваша дзіця. У выпадку змены месца жыхарства таксама паведаміце супрацоўніку цэнтра аб новым месцы жыхарства і пра тое, у якую школу будзе хадзіць ваша дзіця.

Не забудзьце як мага хутчэй даставіць у цэнтр або ў Аддзел абслугоўвання замежнікаў па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве (асабіста, па пошце або ў электронным выглядзе на электронны адрас цэнтра або ZOC або на адрас Дэпартамента сацыяльнай дапамогі) даведку аб залічэнні ў школу або працягу навучання (у пачатку кожнага навучальнага года або калі вы змяняеце месца жыхарства, а ваша дзіця змяняе школу). Без даведкі са школы вы не атрымаеце падручнікі (або ваўчар на іх набыццё).

Падрабязную інфармацыю аб адукацыі дзяцей, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Польшчы, і аб дапамозе, якую вы можаце атрымаць, гл. У даведніку, які вы атрымалі пры рэгістрацыі ў міграцыйным цэнтры, або на сайце **https://www.gov.pl/web/udsc/informacja-o-edukacji-dzieci-dzoziemskich**

## ПОЛЬСКАЯ МОВА

У цэнтры вы можаце прыняць удзел у бясплатных уроках польскай мовы. Заняткі арганізаваныя ў групах. Асобныя ўрокі праводзяцца для дзяцей, якія наведваюць школу, - падчас якіх яны атрымліваюць дапамогу з хатнімі заданнямі, і для дзяцей, якія толькі пачынаюць навучанне ў польскай школе.

Польскую мову ў цэнтры могуць вывучаць і дарослыя. У рамках заняткаў вы даведаецеся, як прадставіць сябе і сваю сям'ю, а таксама вывучыце словы, якія вам спатрэбяцца ў краме, аптэцы, рэстаране, на вуліцы, ва ўрача, у цырульні, у падарожжы, у школе, у паліцыі, пры пошуку працы або арэндзе жылля і пры ўладкаванні кватэры. Вы таксама папоўніце свой слоўнікавы запас і даведаецеся пра звычаі і традыцыі, адміністрацыйны падзел Польшчы і турыстычныя рэгіёны. У некаторых гарадах можна скарыстацца бясплатнымі курсамі польскай мовы, якія праводзяцца няўрадавымі арганізацыямі. Даведайцеся ў супрацоўніка цэнтра, ці магчыма гэта ў вашым населеным пункце. Ад супрацоўніка цэнтра, супрацоўніка Аддзела абслугоўвання замежнікаў па адрасе ul. Taborowa 33 у Варшаве або па тэлефоне гарачай лініі Упраўлення (нумар 47 721 76 75) вы таксама можаце даведацца, ці даступнае ў цяперашні час дыстанцыйнае вывучэнне польскай мовы.



## НАРАДЖЭННЕ ДЗІЦЯЦІ

**Калі ў вас нарадзілася дзіця:**

Даведайцеся ў бальніцы, куды будзе адпраўлена даведка аб нараджэнні, адрас ЗАГСа. ВЫ АТРЫМАЕЦЕ ПІСЬМОВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ З АДРАСАМ ЗАГСа.

↓

Вазьміце з бальніцы даведку аб нараджэнні і ўсе дакументы: бальнічную карту лячэння і г. д.

↓

КАЛІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ВАС ВЯДЗЕЦЦА ПРАЦЭДУРА ПА ПРАДАСТАЎЛЕННЮ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ, перш за ўсё, не забудзьце падаць хадайніцтва аб уключэнні вашага дзіцяці ў вашу працэдуру. Супрацоўнік цэнтра вышле хадайніцтва, а затым, калі вы атрымаеце і прадставіце пасведчанне аб нараджэнні вашага дзіцяці, пацвердзіць яго як сапраўдную копію і адправіць у Дэпартамент працэдур па справах бежанцаў у Варшаве.
КАЛІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ВАС НЕ ВЯДЗЕЦЦА ПРАЦЭДУРА ПА ПРАДАСТАЎЛЕННЮ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ, вам трэба падаць хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны ад імя вашага дзіцяці ў бліжэйшую да вашага месца жыхарства ўстанову памежнай службы, а затым з сапраўдным TZTC вашага дзіцяці з'явіцца ў міграцыйны цэнтр у горадзе Падкова-Лесьна-Дэмбак або Бяла-Падляска, дзе вы зможаце запоўніць заяву аб прадастаўленні вашаму дзіцяці грашовай дапамогі па-за цэнтрам.
Затым аддайце арыгінал пасведчання аб шлюбе супрацоўніку цэнтра для натарыяльнага перакладу на польскую мову, забярыце пераклад (гэта можа заняць некалькі дзён). Калі вы гэтага не зробіце, дзіця не будзе насіць прозвішча бацькі, а толькі прозвішча маці, і ў адпаведнасці з польскім заканадаўствам, біялагічны бацька не будзе мець ніякіх правоў у дачыненні да дзіцяці.
Калі бацька захоча прызнаць дзіцяці пазней, ён павінен будзе падаць заяву аб прызнанні дзіцяці на імя начальніка аддзела ЗАГС. Прызнанне дзіцяці адбудзецца, калі на працягу 3 месяцаў з моманту падачы заявы бацькам дзіцяці маці пацвердзіць гэтую заяву. Калі маці не зробіць гэта ў тэрмін, прызнанне дзіцяці можа адбыцца толькі ў судзе.
Бацька дзіцяці заўсёды можа прызнаць дзіця да яго нараджэння перад начальнікам аддзела ЗАГС. Вы можаце аддаць пасведчанне аб шлюбе за некалькі дзён да родаў. ПАКЛАПАЦІЦЕСЯ, КАБ ДА РОДАЎ У ВАС БЫЛО САПРАЎДНАЕ TZTC - ЯГО АФАРМЛЕННЕ ЗАЙМАЕ КАЛЯ МЕСЯЦА

↓

Звярніцеся ў ЗАГС з сапраўдным TZTC, перакладам пасведчання аб шлюбе і даведкай аб нараджэнні. Разам з гэтымі дакументамі можа быць выдадзена скарочаная копія пасведчання аб нараджэнні.

↓

КАЛІ ВЫ ЖЫВЕЦЕ Ў МІГРАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРЫ, аддайце пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці супрацоўніку цэнтра, КАЛІ ВЫ АТРЫМЛІВАЕЦЕ ГРАШОВУЮ ДАПАМОГУ І ЖЫВЕЦЕ ПА-ЗА ЦЭНТРАМ, аддайце пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці супрацоўніку цэнтра, бліжэйшага да месца вашага пражывання, або ў Аддзел абслугоўвання замежнікаў па адрасе ul. Taborowa 33. Затым запоўніце заяву на атрыманне грашовай дапамогі на дзіця па-за цэнтрам.

↓

Пасля выканання ўсіх вышэйуказаных фармальнасцей вашаму ДЗІЦЯЦІ БУДЗЕ ПРАДАСТАЎЛЕНА САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА. Калі вы знаходзіцеся ў міграцыйным цэнтры, то Ў БЛІЖЭЙШУЮ ВЫПЛАТУ Ў ЦЭНТРЫ ВЫ АТРЫМАЕЦЕ ГРАШОВЫ ЭКВІВАЛЕНТ І ДАПАМОГУ НА НАБЫЦЦЁ АДЗЕННЯ. ДАЙЦЕ СУПРАЦОЎНІКУ ПРОПУСК, КАБ ЁН УНЁС ТУДЫ ВАША ДЗІЦЯ.
Грашовы эквівалент выплачваецца з першага дня месяца, наступнага за датай рэгістрацыі дзіцяці ў цэнтры.

## РАБОТА Ў ЦЭНТРЫ

Пры жаданні вы можаце дапамагаць супрацоўнікам цэнтра ў працы для цэнтра - уборка памяшканняў, дапамога ў вусным перакладзе паміж супрацоўнікамі цэнтра і замежнікамі або правядзенне культурна-адукацыйных мерапрыемстваў (напрыклад, падтрымка дзяцей, якія навучаюцца дыстанцыйна, або іх бацькоў пры звароце ў школу). За вашу дапамогу **вы можаце** раз у месяц атрымліваць дадатковыя кішэнныя грошы ў памеры 50 злотых. На ўсе пытанні і сумненні адкажа супрацоўнік цэнтра.



## ПРАЦА ЗА МЕЖАМІ ЦЭНТРА



Калі вы хочаце працаваць за межамі цэнтра, і ва ўстаноўлены законам тэрмін (г.зн. на працягу 6 месяцаў) у дачыненні да вас не было прынята рашэнне аб прадастаўленні міжнароднай абароны ў першай інстанцыі, г. зн. начальнікам Упраўлення па справах замежнікаў, і калі прычына непрыняцця рашэння ў гэты тэрмін не з'яўляецца вашай вінож, вы можаце звярнуцца за атрыманнм адпаведнай даведкі. Такая даведка змяшчае інфармацыю аб тым, што:

- вы падалі хадайніцтва аб прадастаўленні міжнароднай абароны;
- у цяперашні час у дачыненні да вас вядзецца працэдура;
- рашэнне ў першай інстанцыі не было вынесена ва ўстаноўлены законам тэрмін;
- працэдура зацягваецца не па вашай віне.

Такая даведка сапраўдная да моманту, калі рашэнне па хадайніцтве аб прадастаўленні міжнароднай абароны стане канчатковым. Разам з Часовым пасведчаннем асобы замежніка (TZTC) яна з'яўляецца падставай для выканання вамі працы на тэрыторыі Рэспублікі Польшча (на прынцыпах і ў рэжыме, устаноўленых Законам ад 20 красавіка 2004 года «Аб садзейнічанні занятасці і ўстановах рынку працы»).

## ЯК ПРАДОЎЖЫЦЬ TZTC (ЧАСОВАЕ ПАСВЕДЧАННЕ АСОБЫ ЗАМЕЖНІКА)

Папрасіце ў супрацоўніка цэнтра накіраванне да фатографа і картку з данымі Упраўлення.

↓

Зрабіце фотаздымкі, пакажыце картку з данымі Упраўлення і забярыце фотаздымкі. Рахунак за паслугу фатограф павінен адправіць непасрэдна супрацоўнікам цэнтра. Калі ў вас няма накіравання да канкрэтнага фатографа, не забудзьце ўзяць з сабой рахунак, на падставе якога вы зможаце хадайнічаць аб вяртанні грошай.

↓

Запоўніце разам з супрацоўнікам цэнтра заяву для выдачы новага TZTC.

↓

Аддайце старое TZTC і рахунак, і вам вернуць грошы.

↓

Цяпер супрацоўнік цэнтра адправіць вашыя дакументы на прадаўжэнне па пошце.

↓

Падпішыце атрыманне дакумента ад супрацоўніка.

Правільны фотаздымак павінен мець памеры 35 мм х 45 мм і быць падпісаны імем і прозвішчам заяўніка. Акрамя таго, фотаздымак павінен:

- быць без пашкоджванняў, каляровым, з добрай выразнасцю;
- быць зроблены не раней чым за 6 месяцаў да даты падачы заявы;
- прадстаўляць твар ад верхавіны галавы да верху плячэй, каб твар займаў 70-80% фотаздымка;
- паказваць выразна вочы, асабліва зрэнкі, лінія вачэй павінна быць раўналежная верхняму краю фотаздымка;
- адлюстроўваць чалавека на аднатонным светлым фоне, анфас, які глядзіць прама наперад, з адкрытымі вачыма, непакрытымі валасамі, з натуральным выразам твару і закрытым ротам, а таксама павінен перадаваць натуральны колер скуры;

На фотаздымку з галаўным уборам (дазволена толькі па рэлігійных меркаваннях) павінен быць выразна бачны ўвесь твар (ад падбародка да канца ілба - павінен быць бачны натуральны авал твару).

**У выпадку ўзнікнення праблем звяртайцеся да супрацоўнікаў цэнтра.**

Калі вы атрымліваеце дапамогу за межамі цэнтра, вы можаце спампаваць заяву на замену часовага пасведчання асобы замежніка з сайта https://






cudzoziemcy.gov.pl/pliki-do-pobrania/ і запоўніць яе ў адпаведнасці з інструкцыяй. Пасля запаўнення заявы дадайце адзін падпісаны нядаўні фотаздымак і адпраўце па адрасе: Urząd do Spraw Cudzoziemców, ul. Taborowa 33, 02-699 Warszawa. Новы дакумент будзе адпраўлены вам на адрас, указаны ў заяве.

**Памятайце!**
**Калі ў вас узнікнуць праблемы з рашэннем вашых спраў або пытанняў, якія тычацца сацыяльнай дапамогі, медыцынскага абслугоўвання, звярніцеся за дапамогай да супрацоўніка вашага цэнтра або ў Аддзел па абслугоўванню замежнікаў у Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33. Калі ў вас няма такой магчымасці, тэлефануйце на гарачую лінію Упраўлення па тэлефоне 47 721 76 75 у працоўныя дні з 9.00 да 15.00. Па гэтым жа нумары можна атрымаць інфармацыю па пытаннях прадастаўлення міжнароднай абароны і дакументаў для замежнікаў, якія хадайнічаюць аб прадастаўленні абароны. Звярніце ўвагу, што ў сувязі з абаронай персанальных даных вы не атрымаеце такім чынам інфармацыю аб стане вашай справы, а толькі агульныя інструкцыі і ўказанні.**

## ХАДАЙНІЦТВЫ І СКАРГІ

У любы час вы можаце звярнуцца з заявай на імя начальніка Упраўлення па справах замежнікаў па важнай для вас справе ў сувязі з прадастаўляемай вам сацыяльнай дапамогай альбо працэдурай прадастаўлення статусу бежанца пры пасярэдніцтве супрацоўнікаў цэнтра, адправіць па пошце ці асабіста падаць у галаўным офісе Упраўлення ў Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33.

Вы таксама маеце права падаць скаргу начальніку Упраўлення па справах замежнікаў аб парушэннях, якія, на вашу думку, мелі месца ў сувязі з прадастаўленай вам сацыяльнай дапамогай або бягучай працэдурай прадастаўлення статусу бежанца. Скаргу можна падаць пры пасярэдніцтве супрацоўнікаў цэнтра, адправіць па пошце ці асабіста падаць у галаўным офісе Упраўлення ў Варшаве па адрасе ul. Taborowa 33.

Хадайніцтвы, акрамя хадайніцтваў аб прадастаўленні міжнароднай абароны, а таксама скаргі павінны разглядацца без неабгрунтаваных затрымак. Аднак не пазней, чым праз 30 дзён. У выключна складаных справах, рашэнне якіх патрабуе глыбокага аналізу, гэты тэрмін можа быць прадоўжаны ў адпаведнасці з заканадаўствам. Аб планаваным тэрміне адказу вы будзеце пісьмова праінфармаваныя.





## ВЯРТАННЕ Ў КРАІНУ

**Хто мае права на дапамогу ў добраахвотным вяртанні?**

За дапамогай ў добраахвотным вяртанні на радзіму, куды вы маеце права ўехаць, можна звяртацца як падчас чакання рашэння па справе прадастаўлення міжнароднай абароны, так і калі вы атрымалі рашэнне аб адмове прадастаўлення статусу бежанца або аб непрадастаўленні дадатковай абароны.

**Куды звяртацца?**

Калі вы чакаеце рашэння аб прадастаўленні міжнароднай абароны, вам належыць падаць у Дэпартамент сацыяльнай дапамогі заяву на атрыманне дапамогі ў добраахвотным вяртанні. Акрамя таго, вам трэба звярнуцца ў Дэпартамент па справах бежанцаў з просьбай спыніць справу ў сувязі з вашым намерам вярнуцца добраахвотна.

Калі вы атрымалі рашэнне аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца або дадатковай абароны, вы не падаеце ў Дэпартамент сацыяльнай дапамогі заяву аб прадастаўленні дапамогі ў добраахвотным вяртанні, а толькі заяву аб тым, што вы звярнуліся ў Міжнародную арганізацыю па міграцыі (ІОМ) з просьбай арганізаваць ваша добраахвотнае вяртанне. Вы павінны падаць заяву да заканчэння тэрміну, на працягу якога вы абавязаныя выехаць з Польшчы, г.зн. 30 дзён з моманту атрымання канчатковага рашэння.

**Хто арганізуе паездку?**

Пры падачы заявы аб дапамозе ў добраахвотным вяртанні ўкажыце выбранага вамі арганізатара вяртання: Упраўленне па справах замежнікаў або Міжнародную арганізацыю па міграцыі (ІОМ). Калі вы вырашыце, каб вашае вяртанне было арганізавана ІОМ, вы павінны запоўніць анкету Міжнароднай арганізацыі па міграцыі.

Выбраць арганізатара вы можаце толькі на этапе чакання рашэння аб прадастаўленні вам міжнароднай абароны.

Калі вы атрымалі адмоўнае рашэнне, у вас няма выбару - ваша вяртанне будзе арганізавана ІОМ і прафінансавана Галоўным камендантам памежнай службы. У гэтым выпадку замест заявы аб дапамозе ў добраахвотным вяртанні вы падаеце ў Дэпартамент сацыяльнай дапамогі толькі заяву аб тым, што вы запоўнілі і падалі ў ІОМ заяву аб добраахвотным вяртанні, якое будзе фінансавацца Галоўным камендантам памежнай службы. Падача такой заявы прадаўжае перыяд сацыяльнай дапамогі і медыцынскага абслугоўвання да даты ад'езду.

**Што ўключае ў сябе дапамога ў добраахвотным вяртанні?**

Незалежна ад зробленага выбару дапамога ў добраахвотным вяртанні ўключае:

- індывідуальнае кансультаванне па пытаннях добраахвотнага вяртання;
- набыццё праязнога білета;
- пакрыццё збораў, звязаных з атрыманнем праязнога дакумента, неабходных віз і дазволаў;
- аказанне грашовай дапамогі на харчаванне падчас падарожжа;
- аказанне медыцынскай дапамогі ў падарожжы ў асаблівых сітуацыях;

Акрамя таго, дапамога ў добраахвотным вяртанні, арганізаваная ІОМ, уключае:

- суправаджэнне ў выездзе;
- прадастаўленне замежніку дапамогі пры транзіце, а таксама
- прадастаўленне рэінтэграцыйнай дапамогі ў грашовай і натуральнай форме - у выпадку, калі добраахвотнае вяртанне арганізавана ў рамках праекта, фінансуемага разам з Фондам прытулку, міграцыі і інтэграцыі.

> **УВАГА:**
> **У выпадку, калі вы чакаеце добраахвотнае вяртанне, тэрмін аказання сацыяльнай дапамогі і медыцынскага абслугоўвання павялічваецца да дня,у якім вы павінны пакінуць тэрыторыю Польшчы ў рамах добраахвотнага вяртання.**

**Колькі разоў можна скарыстацца дапамогай?**

Вы можаце атрымаць дапамогу ў добраахвотным вяртанні адзін раз у 2 гады.

**Прававая падстава і кантактныя даныя**

Добраахвотнае вяртанне арганізуецца ў адпаведнасці з Законам аб прадастаўленні абароны замежнікам на тэрыторыі РП, Законам аб замежніках і пагадненнем, заключаным паміж Міністрам унутраных спраў і адміністрацыі Рэспублікі Польшча і Міжнароднай арганізацыяй па міграцыі аб супрацоўніцтве ў галіне добраахвотнага вяртання замежнікаў, якія пакідаюць тэрыторыю РП, ад 12 ліпеня 2005 года. Калі вы зацікаўленыя ў атрыманні дапамогі ў добраахвотным вяртанні праз Упраўленне, вы можаце атрымаць больш падрабязную інфармацыю ў супрацоўніка міграцыйнага цэнтра, у Аддзеле абслугоўвання замежнікаў або, калі вы зацікаўленыя ў атрыманні дапамогі праз ІОМ, - на сайце www.poland.iom.int або па тэл.: (22) 623 81 54, (22) 623 81 88.

# РАШЭННЕ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

## ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ ПАСЛЯ АТРЫМАННЯ РАШЭННЯ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ МІЖНАРОДНАЙ АБАРОНЫ

У залежнасці ад таго, якое рашэнне вы атрымаеце, вам прадастаўляюцца розныя правы, звязаныя з сацыяльнай дапамогай і далейшым знаходжаннем у Польшчы. Праверце, якое рашэнне вы атрымалі і што павінны зрабіць далей (колькі ў вас ёсць часу на розныя фармальнасці). Не забывайце сачыць за тэрмінамі, запісвайце ў свой каляндар, што вам трэба зрабіць і да якога часу!

1. **Рашэнне аб прадастаўленні адной з формаў міжнароднай абароны (статус бежанца, дадатковая абарона).** Калі вы атрымліваеце адну з формаў абароны, сацыяльная дапамога, якую аказвае Упраўленне па справах замежнікаў, заканчваецца праз **два месяцы з дня прыняцця канчатковага рашэння** аб прадастаўленні статусу бежанца.

   Калі вы атрымалі **статус бежанца або дадатковую абарону,** вы павінны прадставіць **не пазней за 60 дзён з дня атрымання рашэння** заяву ў павятовы Цэнтр дапамогі сям'і, які перанакіроўвае заяву ў ваяводскую адміністрацыю для атрымання дапамогі ў рамках праграмы індывідуальнай інтэграцыі. Прадастаўленню дапамогі папярэднічае інтэрв'ю (па месцы вашага пражывання), гэта значыць патрабуецца ацэнка сацыяльным работнікам з павятовага Цэнтра дапамогі сям'і вашай сямейнай, матэрыяльнай і прафесійнай сітуацыі, стану здароўя і веды польскай мовы, а таксама ўзгадненне з інтэграцыйнай праграмай.

   Вы маеце права на атрыманне дапамогі для падтрымкі працэсу інтэграцыі з таго каляндарнага месяца, у якім вы звярнуліся за ёй разам з пакетам дакументаў. Калі вы знаходзіцеся ў міграцыйным цэнтры, вы маеце права на атрыманне дапамогі, пачынаючы з каляндарнага месяца, у якім вы пакідаеце цэнтр.

   Дапамога прадастаўляецца на тэрмін да 12 месяцаў, пачынаючы ад месяца падачы заявы. Больш інфармацыі вы атрымаеце ў павятовых Цэнтрах дапамогі сям'і па месцы вашага пражывання. Інфармацыю пра месцазнаходжанне адпаведнага для вас павятовага Цэнтра вы атрымаеце таксама ў супрацоўніка цэнтра.

2. Калі ваша справа аб прадастаўленні міжнароднай абароны была **спынена,** вы маеце права на сацыяльную дапамогу **на працягу 14 дзён з дня ўручэння канчатковага рашэння** .

3. **Пасля атрымання рашэння аб непрымальнасці хадайніцтва сацыяльная дапамога спыняецца праз два месяцы пасля канчатковага рашэння**.

4. **Пасля атрымання адмоўнага рашэння сацыяльная дапамога спыняецца праз 30 дзён пасля канчатковага рашэння**.

   Калі вы атрымаеце адмоўнае рашэнне, вы можаце звярнуцца за дапамогай у добраахвотным вяртанні. У гэтым выпадку вы атрымаеце фінансавую і арганізацыйную падтрымку з боку Упраўлення і IOM ў набыцці білетаў, падрыхтоўцы паездкі, а таксама зможаце атрымаць дапамогу ў рамках рэінтэграцыі. Сацыяльная дапамога прадастаўляецца да дня выезду з тэрыторыі Рэспублікі Польшча.





## ВАЖНЫЯ КАНТАКТНЫЯ ДАНЫЯ

**Гарачыя лініі**:

- Гарачая лінія Упраўлення па справах замежнікаў
  Тэлефон: 47 721-76-75
- Гарачая лінія медыцынскага аператара (Petra Medica Sp. z o. o.)
  Тэлефон: **22 112-02-06**
  E-mail: kontakt@petramedica.pl
- Гарачая лінія Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (IOM)
  Тэлефон: **22 623-81-88, 22 62-38-154**
- Гарачая лінія Пагранічнай службы
  Тэлефон: **22 500-43-76**

**Кантактныя даныя міграцыйных цэнтраў і ZOC Taborowa:**

- Аддзел абслугоўвання замежнікаў Taborowa
  ul. Taborowa 33
  02-609 Варшава
  Тэлефон: 47 72-175-42
  E-mail: dps.taborowa@udsc.gov.pl
- Прыёмны цэнтр у г.Падкова-Лесьна-Дэмбак
  Podkowa Leśna-Dębak
  05-805 Otrębusy
  Тэлефон: 22 729-80-71
  E-mail: debak@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнт у Ліціне
  Linin
  05-530 Góra Kalwaria
  Тэлефон: 22 736-16-14
  E-mail: linin@udsc.gov.pl
- Прыёмны цэнтр у г. Бяла-Падляска
  ul. Dokudowska 19
  21-500 Biała Podlaska
  Тэлефон: 47 811-22-01
  E-mail: biala.podlaska@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Безволі
  Bezwola 107
  21-310 Wohyń
  Тэлефон: 83 342-26-99
  E-mail: bezwola@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Лукаве
  al. Kościuszki 29
  21-400 Łuków
  Тэлефон: 25 798-25-43
  E-mail: lukow@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Калоніі Горбуў
  Horbów 26A
  21-512 Zalesie
  Тэлефон: 83 375-73-84
  E-mail: horbow@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Беластоку
  ul. Bitwy Białostockiej 7
  15-102 Białystok
  Тэлефон: 85 675-00-91
  E-mail: osrodek.bialystokbud@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Чырвоным Бару
  Czerwony Bór 24/1
  18-400 Łomża
  Тэлефон: 86 215-00-28
  E-mail: osrodek.czerwonybor@udsc.gov.pl
- Міграцыйны цэнтр у Групе
  ul. Libeckiego 1
  86-134 Dragacz
  Тэлефон: 52 332-50-54
  E-mail: osrodek.grupa@udsc.gov.pl



**Грамадскія арганізацыі, дзе вам акажуць бясплатную дапамогу:**

- Stowarzyszenie Interwencji Prawnej (Асацыяцыя прававога ўмяшання)
  ul. Siedmiogrodzka 5/51
  01-204 Warszawa
  Тэлефон: 22 621-51-65
  www.interwizjaprawna.pl
- Helsińska Fundacja Praw Człowieka (Хельсінскі фонд правоў чалавека)
  ul. Wiejska 16
  00-490 Warszawa
  Тэлефон: 22 556-44-40
  www.hfhr.pl
- Fundacja Ocalenie (Фонд «Ратаванне»)
  ul. Krucza 6/14a
  00-537 Warszawa
  Тэлефон: 22 828-50-54
  www.ocalenie.org.pl
- Punkt Konsultacyjny Fundacji "Ocalenie" w Łomży (Кансультацыйны пункт фонда «Ратаванне» у Ломжы)
  ul. Sadowa 8
  18-400 Łomża
  E-mail: biuro@ocalenie.org.pl
  www.ocalenie.org.pl
- Fundacja Nauki Języków Obcych LINGUAE MUNDI (Фонд вывучэння замежных моў LINGUAE MUNDI)
  ul. M. Kopernika 17
  00-359 Warszawa
  Тэлефоны: 22 625-42-53, 22 625-42-67, 22 654-22-18
  www.linguaemundi.pl

- Polskie Forum Migracyjne (Польскі міграцыйны форум)
ul. Szpitalna 5/14
00-031 Warszawa
Тэлефон: 692-913-993
www.forummigracyjne.org
- Fundacja dla Migrantów DOBRY START (Фонд дапамогі мігрантам Добры Старт)
ul. Bracka 18/63, II piętro
00-028 Warszawa
Тэлефон: 22 658-04-87
www.fds.org.pl
- Fundacja Jesuit Refugee Service – JRS Poland (Езуіцкая служба па справах бежанцаў – JRS Польшча)
ul. Rakowiecka 61
02-532 Warszawa
Тэлефон: 605 422 608
www.jrs.center
- Centrum Pomocy Prawnej im.Haliny Nieć (Цэнтр прававой дапамогі ім. Галіны Нець)
ul. Krowoderska 11/7
31-141 Kraków
Тэлефоны: 12 633-72-23, 693-390-502
www.pomocprawna.org
- Fundacja Instytut na rzecz Państwa Prawa (Фонд «Інстытут для прававой дзяржавы»).
ul. Chopina 14/70
20-023 Lublin
Тэлефон: 81 743-68-00
www.panstwoprawa.org
- Fundacja Obywatelska Perspektywa (Фонд «Грамадзянская перспектыва»).
ul. Puławska 24b/14
02-512 Warszawa
Тэлефон: 501-022-598
www.obywatelska.org.pl
- Fundacja Dialog (Фонд «Дыялог»).
ul. ks. A. Abramowicza 1
15-872 Białystok
Тэлефон: 85 742-40-41
www.fundacjadialog.pl
- Fundacja dla Wolności (Фонд для свабоды)
ul. Ordynacka 9
00-364 Warszawa
E-mail: info@fundacjadlawolnosci.org
www.fundacjadlawolnosci.org
- Fundacja Emic (Фонд «Эмік»)
ul. Klonowica 40/1
87-100 Toruń
Тэлефон: 507-412-653
www.emic.com.pl
- Fundacja Emic (Фонд «Эмік»)
ul. Gdańska 128
85-021 Bydgoszcz
Тэлефон: 501-186-730
www.emic.com.pl
- Stowarzyszenie Centrum Wolontariatu (Асацыяцыя «Цэнтр валанцёрства»)
ul. Gospodarcza 2
20-217 Lublin
Тэлефон: 81 534-26-52
www.wolontariat.lublin.pl
- Stowarzyszenie dla Ziemi (Асацыяцыя «За Зямлю»)
Bratnik 5
21-132 Kamionka
Тэлефон: 603-882-082
www.dlaziemi.org



**Міжнародныя арганізацыі:**

- **Міжнародная арганізацыя па міграцыі (IOM)**
ul. Wiejska 12
00-490 Warszawa
Тэлефоны: 22 623 81 54, 22 623 81 88
www.poland.iom.int
- **Прадстаўніцтва Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (UNHCR)**
ul. Przemysłowa 30
00-450 Warszawa
Тэлефон: 22 628 69 30
www.unhcr.org

**Падрабязную інфармацыю аб грамадскіх арганізацыях, якія дзейнічаюць у інтарэсах замежнікаў, можна атрымаць у супрацоўнікаў цэнтра або ў Аддзеле абслугоўвання замежнікаў.**

## СЛОЎНІК

**Асноўныя выразы**
**Jestem…** Я… (назавіце імя і прозвішча)
**Nazywam się** Мяне завуць …(назавіце імя і прозвішча або прозвішча)
**Mam na imię** Маё імя …(назавіце імя)
**Miło mi cię poznać.** Прыемна пазнаёміцца.
**Jak się nazywasz?** Як цябе завуць?
**Jak masz na imię?** Як тваё імя?
**Jak masz na nazwisko?** Якое твае прозвішча?
**Nie mówię po polsku.** Я не размаўляю па-польску.
**Nie rozumiem.** Я не разумею.
**Nie wiem.** Я не ведаю.
**Proszę mówić wolniej.** Калі ласка, гаварыце павольней.
**Czy możesz powtórzyć?** Ты можаш паўтарыць?
**Czy możesz to przeliterować?** Ты можаш сказаць гэта па літарах?
**Co słychać?** Як справы?
**Wszystko w porządku.** Усё ў парадку.
**Jak się czujesz?** Як сябе адчуваеш?
**Dobrze.** Добра.
**Źle** Дрэнна
**Skąd jesteś?** Адкуль ты?
**Jestem z …** Я з …
**Teraz mieszkam w Polsce.** Цяпер я жыву ў Польшчы.
**Gdzie mieszkasz?** Дзе ты жывеш?
**Mieszkam w …** Я жыву ў …(назваць горад).
**Jak dojechać do …** Як дабрацца да …
**Czy możesz mi powiedzieć jak mam dojechać do…** Ці можаш мне сказаць, як дабрацца да…
**Jak mogę dojechać/dojść pod ten adres…** Як я магу дабрацца па гэтаму адрасу… (паказаць адрас).
**Jaki numer autobusu/tramwaju jedzie do…** Які нумар аўтобуса/трамвая ідзе……
**Gdzie jest…?** Дзе ёсць…?
**Gdzie się znajduje…?** Дзе знаходзіцца…?
**Tam** Там
**W prawo** Направа
**W lewo** Налева
**Prosto** Прама
**Czy możesz mi pomóc?** Ці можаш мне дапамагчы?
**Potrzebuję pomocy.** Мне патрэбна дапамога.

**Ветлівыя выразы:**
**dzień dobry** вітаю
**do widzenia** да пабачэння
**do zobaczenia** убачымся
**dobry wieczór** добры вечар
**dobranoc** дабранач
**cześć!** прывітанне!
**proszę** калі ласка
**dziękuję** дзякуй
**nie ma za co** няма за што
**przepraszam** прабачце
**przykro mi** мне шкада
**(toast) na zdrowie!** (тост) за ваша здароўе!

**Час**
**Rano** Зранку
**W południe** Апоўдні
**popołudniu** удзень
**Wieczorem** Вечарам
**W nocy** Ноччу
**Wczoraj** Учора
**dzisiaj** сёння
**jutro** заўтра
**tydzień** тыдзень
**miesiąc** месяц
**rok** год
**wiek** век
**godzina** гадзіна
**kwadrans** чвэрць гадзіны
**minuta** хвіліна
**trzy dni temu** тры дні таму
**za trzy dni** праз тры дні

**Пытанні**
**jak?** як?
**co?** што?
**jak dużo?** як шмат?
**kto?** хто?
**gdzie?** дзе?
**kiedy?** калі?
**dlaczego?** чаму?
**który?** які?
**Ile?** колькі?

**Сям' я**
**Żona** Жонка
**Mąż** Муж
**Rodzic** Бацька, маці
**Rodzice** Бацькі
**Dziecko** Дзіця
**Dzieci** Дзеці
**Mama** Мама
**Tata** Тата
**Córka** Дачка
**Syn** Сын
**Babcia** Бабка
**Dziadek** Дед
**Brat** Брат
**Siostra** Сястра
**Ciocia** Цётка
**Wujek** Дзядзька
**Kuzyn** Страечны (дваюрадны) брат



## ВАРШАВА

**Кароткая інфармацыя пра Варшаву:**

Варшава — найбуйнейшы польскі горад з пункту гледжання насельніцтва і плошчы. Гэта навуковы, культурны, палітычны і эканамічны цэнтр еўрапейскага маштабу. Тут размешчаныя сядзібы Прэзідэнта, Сейма і Сената, Савета міністраў, Нацыянальны банк Польшчы, а таксама іншыя міжнародныя інстытуцыі і цэнтральныя ўлады.

Калі вы хочаце больш даведацца аб гэтым цудоўным горадзе, вы можаце наведаць цікавыя музеі, уваход у якія ў асобныя дні з'яўляецца **БЯСПЛАТНЫМ:**

- Centrum Sztuki Współczesnej (Цэнтр сучаснага мастацтва), ul. Jazdów 2 : **ЧАЦВЕР**, з 12 да 19
- Zachęta (Нацыянальная галерэя мастацтваў «Захента»), pl. Małachowskiego 3 : **ЧАЦВЕР**, з 12 да 20
- Muzeum Narodowe (Нацыянальны музей), Al. Jerozolimskie 3: **АЎТОРАК**, з 10 да 18 (толькі пастаянныя экспазіцыі)
- Królikarnia (Палац Крулікарня), ul. Puławska 113a : **АЎТОРАК**, з 10 да 18
- Instytut Wzornictwa Przemysłowego (Інстытут прамысловага дызайну), ul. Świętojerska 5/7: **СЕРАДА**, з 10 да 19
- Zamek Królewski (Каралеўскі замак), pl. Zamkowy 4, **НЯДЗЕЛЯ**, з 10.50 да 15
- Muzeum Karykatury (Музей карыкатуры), ul. Kozia 11 : **АЎТОРАК**, з 10 да 18
- Muzeum Powstania Warszawskiego (Музей Варшаўскага паўстання), ul. Grzybowska 79 : **ПАНЯДЗЕЛАК** з 10 да 18
- Muzeum Pałac w Wilanowie (Вілянаўскі палац-музей), ul. Stanisława Kostki Potockiego 10/16, **ЧАЦВЕР** з 11 да 15
- Muzeum Wojska Polskiego w Warszawie (Музей Войска Польскага ў Варшаве), ul. Al. Jerozolimskie 3: **ЧАЦВЕР**, з 10 да 16

У Варшаве ёсць таксама Мультыкультурны цэнтр па адрасе ul. Jagiellońskiej 54. Больш інфармацыі можна знайсці на сайце http://cw.org.pl/ і http://www.info-migrator.pl/.

Больш падрабязную інфармацыю пра культурныя падзеі ў Варшаве і за яе межамі можна знайсці на наступных сайтах:

- Варшава ў двух словах – https://warszawawpigulce.pl/
- Рэкамендаваныя падзеі ў Варшаве – https://waw4free.pl/
- Партал сталіцы Варшавы – http://kulturalna.warszawa.pl/
- Варшава – афіцыйны турыстычны сайт – https://warsawtour.pl
- Pik Warszawa – бясплатныя мерапрыемствы – https://pik.warszawa.pl/tag/za-darmo-w-warszawie/
- Бясплатныя мерапрыемствы па ўсёй Польшчы - https://www.kiwiportal.pl/wydarzenia/darmowe



## ЯК ДАЕХАЦЬ ДА ПРЫЁМНАГА ЦЭНТРА ў г. ПАДКОВА-ЛЕСЬНА-ДЭМБАК

Як даехаць з вакзала Warszawa Śródmieście WKD да прыёмнага цэнтра ў г. Падкова-Лесьна-Дэмбак.

1. Накіроўвайцеся на прыпынак Warszawa Śródmieście WKD, знайдзіце цягнік (электрычку) у напрамку Grodzisk Mazowiecki, Milanówek або Otrębusy. Выходзіце на **8** прыпынку **OTRĘBUSY.**
2. Затым прытрымлівайцеся карты ніжэй.
3. Замежнікі, **якія маюць Часовае пасведчанне асобы замежніка** (TZTC), **могуць карыстацца бясплатным праездам** на вышэйуказаным маршруце. Падчас праверкі білета прад'явіце дакумент TZTC.
4. Калі ў вас няма сапраўднага Часовага пасведчання асобы замежніка, **вы павінны** падайці ў касу **і купіць білет на цягнік** да станцыі Otrębusy.

